НОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:	
На 1 месяц	90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	20 к.
мясцовыя	10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:	
За радок нанпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нанпарэлі насярод тэксту	1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпешныя на 50 проц. даражэй.
Зьмен тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:	
За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, па ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 33 (2221) Серада, 8-га лютага 1928 г.

ПРА БЕЛАРУСІЗАЦЫЮ.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР ухваліў пастанову аб практычных мерапрыёмствах па выкананьню пастановы Прэзыдыуму Савету Нацыянальнасьцяй ЦВК Саюзу ССР па дакладу Ўраду БССР аб беларусізацыі.

Прэзыдыум Савету Нацыянальнасьцяй ЦВК СССР у сваёй пастанове з вялікім задаволеньнем адзначыў, што, ня гледзячы на цяжкае гістарычнае мінулае Беларусі і шэраг цяжкасьцяй сучаснага пэрыяду, БССР мае значныя дасягненьні ў справе беларусізацыі і наогул у справе ажыцьцяўленьня нацыянальнае палітыкі. На падставе ўзмацненьня кіруючае ролі рабочае клясы і ўздыму палітычнае актыўнасьці працоўных усіх нацыянальнасьцяй БССР пашыраецца культурнае будаўніцтва (Вуз'ы, школы, тэатры, літаратура і інш.), беларусізацыя савецкага апарату, карэнізацыя савецкіх устаноў і грамадзкіх арганізацый за кошт вылучэньня работнікаў з працоўнага беларускага насельніцтва.

Некалі прыгнечаная, занядбалая Беларусь зараз вышла на шырокі шлях дзяржаўнага будаўніцтва, уваходзіць у вольны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, як роўнапраўная частка, і ўдзельнічае ў агульным будаўніцтве сацыялізму ў нашай краіне. За час свайго дзяржаўнага існаваньня БССР мае буйныя посьпехі ў справе свайго нацыянальнага і гаспадарчага будаўніцтва. Пабудова Асінаўскае электрычнае станцыі, пабудова шэрагу новых фабрык і заводаў павінна перайначыць твар нашае краіны, будзе дапамагаць будаўніцтву новае вёскі на калектыўных пачатках. Буйныя посьпехі ў справе каапэраваньня насельніцтва Беларусі сьведчаць аб тым, што працоўныя БССР цьвёрда і бязухільна ідуць да новага жыцьця, да сацыялізму.

Мы можам адзначыць значныя посьпехі ў справе беларусізацыі нашага савецкага апарату. Пачынаем на практыцы ажыцьцяўляць ленінскія запаветы аб тым, каб усё больш шырокія пласты насельніцтва ўцягваць у справу сацыялістычнага будаўніцтва. 19.286 працоўных у працягу мінулага году працавалі ў розных роду камісіях пры нашых сельскіх і мястэчкавых саветах. Усё больш узрастае лік беларусаў, якія ўваходзяць у склад нашых саветаў. У 1927 годзе ў саветы ўваходзіла 92,3 проц. беларусаў. У сельскія саветы ўваходзяць дзесяткі тысяч сялян, якія прымаюць актыўны ўдзел у нашым будаўніцтве.

Нізкі культурны ўзровень як усяго нашага насельніцтва, так і працаўнікоў нізавога савецкага апарату значна ўплывае на посьпех усяе нашае працы. Больш паловы нашага дарослага насельніцтва ўсё яшчэ застаецца няпісьменнаю. Слаба развітая школьная сетка па ліквідацыі няпісьменнасьці перашкаджае правядзенью беларусізацыі і наогул усяе нашае працы. Беларусізацыя ў вышэйшых навучальных установах і часткі сярэдніх школ прафтэхнічнай асьветы праводзіцца занадта павольна. Недахват падрыхтаваных кадраў настаўніцтва і наогул культурных працаўнікоў для праведзеньня ўсяе працы па беларусізацыі значна ўплывае на больш пасьпяховы тэмп працы ў гэтай галіне.

Маючы значныя і буйныя посьпехі ў справе беларусізацыі нашага апарату, мы адзначаем, што на культурным фронце ў сэнсе беларусізацыі ў нас посьпехаў куды менш. Мы дагэтуль мала зьвярталі ўвагі на падрыхтоўкі беларусоў—навуковых працаўнікоў, а таксама на разьвіцьцё працы па вывучэньні беларускае мовы навуковымі працаўнікамі іншых нацыянальнасьцяй.

Значныя перашкоды для паскораньня беларусізацыі нашых навучальных устаноў і наогул усіх культурных арганізацый стварае адсутнасьць патрэбнае тэрмінолёгіі. Праца, якая ў гэтым напрамку праводзіцца Інстытутам Беларускае Культуры дагэтуль, пасоўваецца яшчэ занадта марудна. У гэтай справе Інбелкульту павінна дапамагчы ўся нашая савецкая грамадзкасьць, якая магла-бы шмат карысьці ўнесьці пры складаньні гэтае тэрмінолёгіі. Трэба забясьпечыць Інбелкульту больш сродкаў і дапамогі, патрэбнае яму для ажыцьцяўленьня гэтае справы.

Калі ў нашым адміністрацыйным апараце справа беларусізацыі больш-менш наладжана, дык зусім дрэнна яна праводзіцца ў гаспадарчых установах. Гэтая частка нашага савецкага апарату дагэтуль лічыла, што яе гэтае права менш усяго датычыцца. Гэтая пастанова нашага ўраду павінна быць апошнім напамінам апарату нашых трэстаў і ўстаноў аб тым, што беларусізацыя ў іх безадкладна павінна быць праведзена.

Усё яшчэ слаба ў нас абстаіць справа з выданьнем літаратуры і падручнікаў на роднай мове, як беларускага насельніцтва, гэтак сама і насельніцтва іншых нацыянальнасьцяй нашае рэспублікі. Недахват сродкаў і тэхнічных магчымасьцяў (друкарскія) пры сучасных умовах не дазваляе нам у належнай меры наладзіць выдавецкую справу: нашыя кнігі тэхнічна выходзяць вельмі дрэнна. Нашыя газэты часам выходзяць так, што іх і прачытаць нельга. Слабая друкарская тэхніка нашая вельмі ўплывае на ўдаражаньне кошту кніжкі і газэты, што, зусім зразумела, перашкаджае прасоўваньню іх у шырокія масы нашага насельніцтва.

Вось чаму Прэзыдыум Савету Нацыянальнасьцяй СССР лічыў неабходным высунуць пытаньне аб пашырэньні выдавецкае справы ў БССР, для чаго паставіць пытаньне аб дадатковых асыгнаваньнях на беларускія выдавецтвы як з рэспубліканскіх, гэтак і з грамадзкіх сродкаў.

За ажыцьцяўленьне дырэктыў Саюзнага і Беларускага ўраду аб практычным правядзеньні мерапрыёмстваў па беларусізацыі павінны ўзяцца ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі на мясцох, да гэтае справы павінна быць прыцягнута ўвага ўсяе нашае савецкае грамадзкасьці, каб у бягучым годзе мы змаглі поўнасьцю ажыцьцёвіць дырэктывы аб беларусізацыі.

Па артыкулах царскага кодэксу.

Адначасова з працэсам Беларускае Рабоча-Сялянскае Грамады, па якому польскі ўрад зьбіраецца ў бліжэйшай будучыне судзіць звыш 800 рабочых, сялян, настаўнікаў, працаўнікоў каапэрацыі і дэпутатаў сойму, пракуратура скончыла складаньне абвінавачваючага акту па справе «133», якая назначана да разгляду ў Беластоку на 7 лютага. Справа «133» ці як яе афіцыйна называе судовая ўлада «Працэс кампартыі З. Беларусі», узьнікла яшчэ ў 1925 г. непасрэдна пасьля крывавага прыдушэньня сялянскіх партызанскіх паўстаньняў, якімі была ахоплена ў той час З. Беларусь. Польская ўлада разаслала тады карныя атрады па ўсіх беларускіх сёлах. Тысячы партызан былі забіты ў няроўнай бойцы, растраляны па прысудах палявых судоў, ці высланы на катаргу. Увесь сьвет загаварыў аб жахах, якія распачаліся ў гэтай акраіне, якая мела няшчасьце трапіць пад прыгон польскіх фашыстаў і абшарнікаў.

Каб апраўдаць сябе перад грамадзкаю думкаю Эўропы і Амэрыкі, дзе польскі ўрад знаходзіць сталае падтрыманьне сваім імпэрыялістычным плянам і стала шукае крэдытаў, яму трэба стварыць уражаньне, што грамадзянская вайна ў Заходняй Беларусі ня выклікана яго бязьлітаснаю палітыкаю нацыянальнага прыгнечаньня і суровай эксплёатацыі працоўнага жыхарства, а старонкім уплывам. Пры дапамозе правакатараў на шматлікіх працэсах 1925-26 г., на судзе ў тым ці ў іншым выглядзе фігуравала пазьменная вэрсыя аб «грошах чужаземнага пахаджэньня», аб прыбыўшых з-за граніцы «агітатарах» і г. д. Нібы ў Заходняй Беларусі ўсё было спакойна. Нібы польскі ўрад не абрабаваў сялян, раздаўшы іх землі вайсковым калёністам, «асаднікам», запасным чынам польскае арміі і жандармэрыі каб набыць у асобе гэтага казацтва патрыятычную апору на мяжы Савецкае Беларусі. Нібы ня было і няма сыстэматычнага прыгону проці беларускае нацыянальнае культуры, мовы, школы, каапэрацыі. Нібы да таго часу астрогі Вільні, Беластоку, Горадні, Навагрудку і старое Польшчы ня былі перапоўнены рабочымі і сялянамі, засуджанымі на доўгагадовае зьняволеньне за ўдзел у эканамічным руху, у барацьбе за кавалак чорнага хлеба і зьмяншэньне вялікае арэнднае платы.

Як правіла, усе паказаньні правакатараў аб „чужаземным кіраўніцтве“, партызанскай барацьбой даведзеных да роспачы сялян, выкрывалі на судзе ўсю сваю фальшывасьць і недарэчнасьць. Гэта, зразумела, не перашкаджала польскім судзьдзям ухваляць бестэрміновыя і доўгагадовыя катаржныя прысуды.

Але трэба ўрэшце даказаць існаваньне старонняга ўплыву, альбо прызнаць перад усім сьветам, што грамадзянская вайна ў Заходняй Беларусі мае свае карэньні ў палітыцы, праводзімай па зазначэньню з Варшавы.

І вось, у жніўні 1925 г. у Беластоку, Бельску і інш. пунктах распачынаюцца масавыя арышты. Сярод арыштаваных хлопчыкі і падлеткі ўзростам 15-16 гадоў. Дэфэнзыва ўтварае спэцыяльныя памяшканьні для допыту ў ваколіцах гораду, каб стогны арыштаваных не даходзілі да мясцовых жыхароў. Сьледзтвам кіруе ранейшы царскі пракурор Зубілевіч, ведамы манархіст і чорнасоценец, які заваяваў сваю сумную славу яшчэ па сваёй дзейнасьці ў кіеўскай судовай палаце. У вялізным томе абвінавачваючага акту, як асноўныя, паказаньні правакатараў, у тым ліку Гурына, які раней нават здолеў пралезьці ў шэрагі беларускіх рэвалюцыянэраў. Абвінавачаньне выклікае звыш 200 сьведак, галоўным чынам, паліцэйскіх і шпікаў. Абарона пасьля доўгага дамаганьня атрымала права вызаву сьведкаў, але за ўласны кошт. Так фабрыкуецца працэс кампартыі З. Беларусі, разгляд якога распачнецца 7 лютага.

Разгляд гэтае справы супадае з адным значным юбілеем, які датычыцца эпохі барацьбы рабочае клясы Расеі з царызмам. У гэтым годзе міне 25-ці годзьдзе «Крымінальнага Ўкладу» 1903 году, на падставе якога царскія суды пасылалі на шыбеніцу і высылалі ў Сібір дзесяткі барацьбітоў за рабочую справу. Водлуг жа гэтых артыкулаў, па артыкулах таго-ж «Крымінальнага Ўкладу», захаваўшага сваю моц у Польшчы, урад польскае рэспублікі будзе цяпер судзіць рэвалюцыянэраў Заходняе Беларусі.

Л. В.

Кітайская рэвалюцыя на новым этапе.

УВЕСЬ ПОЎДЗЕНЬ АХОПЛЕН КАМУНІСТЫЧНЫМІ ПАЎСТАНЬНЯМІ.

ЛЯ НАНЧАНУ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАЎСТАНЬНЕ.

ТОКІЁ, 6-II. Водлуг вестак японскага міністэрства замежных спраў, у Гуаналёміне (недалёка ад Нанчану, правінцыя Цьзянсі) выбухнула камуністычнае паўстаньне. Кітайская ўлада паслала ў Гуаналамін войска для прыдушэньня паўстаньня.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ ПАЎСТАНЬНІ Ў ЦЬЗЯНСУ.

ШАНХАЙ, 6-II. Водлуг паведамленьняў «Фар Істэрн Таймс» у Вусі (правінцыя Цьзянсу) 5-га лютага выбухнулі нібы «кіруемыя камуністамі» непарадкі.

АКРУГА СВАБУЭ ПАД УЛАДАЮ РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ.

ПЕКІН, 6-II. Агенцтва Говэн паведамляе з Шанхаю, што атрады камуністычнае арміі ізноў занялі акругу Свабуэ (на паўднёвым усходзе правінцыі Хуандунь).

РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ ВОЙСКА ЛЯ КАНТОНУ.

ПЕКІН, 6-II. Водлуг паведамленьняў з Шанхаю, рэвалюцыйнае войска правінцыі Гуандунь зноў заняло Хайфун—за 150 клм. на ўсход ад Кантону.

ТРЫВОГА Ў ШАНХАІ.

ШАНХАЙ, 6-II. Водлуг паведамленьняў афіцыйнага нанкінскага агенцтва Го-Мінь, шанхайская вайсковая ўлада атрымала весткі, што ў Шанхаі пры падтрыманьні агентаў Сун-Чуан фана рыхтуецца „камуністычнае паўстаньне“. Улада зрабіла папераджаючыя крокі. Шанхай-Ханьчжоўская чыгунка ахоўваецца ўзмоцненаю вартаю. На чыгуначных каляінах у некаторых мясцох нібы знойдзены бомбы.

Тое-ж агенцтва паведамляе, што «Сун-Чуан-фан аддаў 150 тысяч даляраў для подкупу нацыянальных войск».

МАНІФЭСТ ГАМІНДАНУ АБ АДНОСІНАХ ДА СССР.

ШАНХАЙ, 6-II. Друк паведамляе, што пленум выканкому Гаміндану мяркуе агаласіць маніфэст аб адносінах нанкінскага ўраду да Японіі і СССР.

РАЗНАГАЛОСЬСІ НА ПЛЕНУМЕ ЦК ГАМІНДАНУ.

ТОКІЁ, 6-II. Водлуг паведамленьня з Нанкіну, на пленуме выканкому Гаміндану ўзьніклі рознагалосьсі ў справе разьмежаваньня правоў галоўнакамандуючага і вайсковае рады.

СЮЧЖОУ НА ВАЕННЫМ СТАНОВІШЧЫ.

ШАНХАЙ, 5-II. У Сучжоу (правінцыя Цьзянсу, за 80 кілёмэтраў на захад ад Шанхаю па чыгунцы Шанхай—Нанкін) абвешчана ваеннае становішча. Арыштавана 6 камуністаў. У часе вобыскаў захоплена «шмат камуністычнае літаратуры» і сьпіс 200 сючжоўскіх сяброў кітайскае камуністычнае партыі.

НОВАЯ ПАЗЫКА НАНКІНА.

ШАНХАЙ, 6-II. Водлуг паведамленьняў «Сін-Ван-Бао», міністэрства фінансаў нанкінскага ўраду пастанавіла выпусьціць новую пазыку ў разьмеры 16 міліёнаў даляраў. Пазыка будзе забясьпечана паступленьнем ад дадатковых мытаў.

НОВЫ МІНІСТР ЗАМ. СПРАЎ НАНКІНУ.

ТОКІЁ, 6-II. Водлуг паведамленьняў «Осака Майніці», міністрам замежных спраў нанкінскага ўраду назначан Ван-Чжэн-цін (правы гаміндававец).

Зьверствы мукдэнскіх карных атрадаў.

ПЕКІН, 7-II. Агенцтва Рэйтэра паведамляе, што войска генэрал-губарнатара Мукдэнскае правінцыі захапіла 3-га лютага апаратыўную базу „вялікіх нажоў“. У захопленых войскам двух вёсках вырэзаны ўсе мужчыны старэй 12-ці гадоў. Абураныя гэтаю расправаю „вялікія нажы“ заяўляюць, што ў бліжэйшы час яны зробяць новы наскок на Дункуа.

СТАЧКІ Ў МУКДЭНЕ.

ПЕКІН, 7-II. Агенцтва Тохо паведамляе, што ў Мукдэне забаставала 1.300 кітайскіх служачых тытунёвае кампаніі Тоа. Бастуючыя патрабуюць, каб пэнсія выплачвалася ім золатам, а не паперкамі. Кітайская паліцыя Мукдэну таксама абвясьціла забастоўку, тлумачачы гэта тым, што на пэнсію паліцэйскіх нельга існаваць.

Здань рэвалюцыі на Пірынеях.

ПАЎСТАНЬНЕ Ў ЛІСАБОНЕ.

ПАРЫЖ, 6-II. «Тан» паведамляе з агаворкаю, што водлуг чутак, сёньня ў 10 гадзін раніцы на гандлёвым пляцы ў Лісабоне забіты партугальскі дыктатар Кармона, і што ў горадзе выбухнула паўстаньне.

БАРАЦЬБА ГІШПАНСКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ.

ПАРЫЖ, 6-2. Мадрыдзкія карэспандэнты агенцтва Гавас і газэты „Тан“ паведамляюць падрабязнасьці забастовачнага руху ў Гішпаніі, які ўзьнік у зьвязку з увядзеньнем падатку на заробатак. Першымі забаставалі рабочыя друкарняў 2-х мадрыдзкіх газэт. Пасьля заявы ўраду, што прадпрыёмцы маюць права звольніць забастоўшчыкаў у выпадку, калі забастоўка працягнецца больш 43-х гадзін, рабочыя аднавілі працу. Прыдушаны ў Мадрыдзе рух узьнік у іншых гарадох, як напр., у Равусе, Бадалёне, Махтаро, Барсэлёне і інш. Урад зноў заявіў, што забастоўка ня можа быць дапушчана. Водлуг слоў урадавага паведамленьня, гэта ўнесла «значны спакой» і толькі ў Барсэлёне яшчэ ня зьліквідавана некалькі асяродкаў забастоўкі.

Карэспандэнт Жарналь-дэ-Дэба аднак паведамляе, што забастовачны рух у гэтых гарадох узмацніўся і што ў Равусе дайшло нават да крывавых стычак з паліцыяй. Далей зазначаецца, што ў Равусе была праведзена ўсеагульная забастоўка. У Матаро і Рубі спынілі працу ўсе заводы. У Барсэлёне, дзе да забастоўкі далучыліся 2 тысячы рабочых ф-кі Кортэ, становішча вельмі напружанае, бо ў панядзелак чакаецца лёкаут. Гэтая «мера—піша карэспандэнт Жарналь-дэ Дэба»,—можа выклікаць за сабою сур'ёзныя непарадкі“.

БЛІЗКАЕ АДНАЎЛЕНЬНЕ ФРАНКА-САВЕЦКІХ ПЕРАМОЎ.

ПАРЫЖ, 6-2. Камітэт індывідуальных уласьнікаў расейскіх каштоўных папер заявіў сэнатару дэ-Монзі аб пажаданьні неадкладна аднавіць франка-савецкія перамовы, перапыненыя пасьля выезду Ракоўскага з Парыжу. Дэ-Монзі абяцаў перадаць просьбу камітэту Пуанкарэ і Брыяну. Пры гэтым дэ-Монзі адказаў, што Брыян «пачаў яшчэ больш прыхільна адносіцца да думкі аб аднаўленьні перамоў пасьля вотуму сэнату наконт інтэрпэляцыі аб замежнай палітыцы французскага ўраду».

БАРАЦЬБА ЧЭСКІХ ГАРНЯКОЎ ПАД ПАГРОЗАЮ ЗДРАДЫ.

ПРАГА, 6-II. Учора аб'яднаная канфэрэнцыя прафэсыянальных арганізацый рабочых гарнякоў пасьля доўгае нарады ўхваліла пастанову адкласьці абвяшчэньне забастоўкі на прадпрыёмствах па здабычы бурага вугалю яшчэ на адзін тыдзень. Гэтая пастанова тлумачыцца неабходнасьцю «зрабіць усё магчымае для ўпарадкаваньня канфлікту мірным шляхам».

За неадкладнае абвяшчэньне забастоўкі галасавалі камуністы, за адцягненьне—чэскія і нямецкія рэфармісты.

Працэс Сьцяфанава.

СУД ПРЫЗНАЎ, ШТО ПАПЯРЭДНІЯ ПАКАЗАНЬНІ ПАДСУДНЫХ БЫЛІ ВЫМУШАНЫ КАТАВАНЬНЯМІ Ў АХРАНЦЫ.

ВЕНА, 6-2. На чацьверты дзень працэсу допыт Сьцяфанава скончыўся. Падрабязна спыніўшыся на адхіленьнях па ўсіх пунктах акту абвінавачаньня, Сьцяфанаў заявіў: „Кампартыя імкнецца скінуць сучасны рэжым праз арганізаваную масавую барацьбу рабочае клясы. Па закону на лаўцы падсудных павінны былі сядзець тыя, хто абвінавачвае вас. Нездаволеньне сялянства ўзбуджае не кампартыя, а сучасны рэжым з яго злоўжываньнямі ў галіне аграрнае рэформы, антысацыяльнаю падатковаю палітыкаю і палітычным прыгнечаньнем». Нарэшце Сьцяфанаў патрабаваў скасаваць усе законы, якія служаць для прыгнечаньня пралетарыяту.

Пасьля Сьцяфанава дапытвалі юнака Захарэску. Ён адхіліў высунутае проці яго абвінавачаньне і заявіў пратэст проці допыту судом агента ахранкі ў якасьці сьведкі абвінавачаньня. Ад сваіх паказаньняў на папярэднім дазнаньні Захарэску адмовіўся, заявіўшы, што яны былі вымушаны ад яго катаваньнямі. Увесь працэс Захарэску характарызаваў, як інсцэніроўку, наладжаную ахранкаю. Ён заявіў, што суд мае справу не з працэсам проці 5-ці абвінавачаных, а са спробаю прыцягнуць у іх асобе да адказу ўсю рабочую клясу, каб запужаць яе, але чым працэс ня скончыўся-б, рабочая кляса і кампартыя сябе запужаць не дадуць. Выкрыцьці, зробленыя Захарэску, прымусілі старшыню адзначыць што ранейшыя паказаньні былі вроблены абвінавачанымі пад катаваньнем.

Дапрошаны затым рабочы-сьлесар Лука даў страшэнны малюнак пакутаў рабочае клясы ў Румыніі, якая вымушана працаваць у працягу 9-11 гадзін штодня і пры гэтым галадаць, атрымліваючы жабрацкі заработак. Свае заявы Лука падмацаваў статыстычнымі данымі. Падобна Захарэску, ён таксама адмовіўся ад сваіх паказаньняў на папярэднім дазнаньні, вымушаных ад яго катаваньнямі.

Орган румынскае сацыял-дэмакратыі называе працэс Сьцяфанава «судом над ідэямі» і патрабуе апраўдаць Сьцяфанава.

Рэпрэсіі проці рэвалюцыйнага прафруху ў Францыі.

ЗАБАРОНА ПРАФСАЮЗНАГА ОРГАНУ ТРАНСПАРТНІКАЎ.

ПАРЫЖ, 6-II, Улада забараніла выданьне рэвалюцыйнага прафсаюзнага органу «Травайер Інтэрнасіональ дэ Транспарт», які выходзіў на арабскай мове. Як растлумачыла ўлада, забароне падлягае ўсякі орган таго-ж напрамку і выходзячы на той самай мове, хоць бы пад рэдакцыяю і іншае адказнае асобы і ў іншым выдавецтве“.

Канфіскаваны першы нумар органу эльзаскіх аўтанамістаў „Дэр Шыфстан“, які зьявіўся замест забароненага „Дэр Мюльстан“.

ПАЧАТАК РАЗГРОМУ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

ПАРЫЖ, 6-2. Вялікі атрад паліцыі зьявіўся ў памяшканьне ўнітарнае канфэдэрацыі працы з мэтаю затрымаць сэкратара 20 прафсаюзнага раёну камуніста Гайяра, засуджанага на 4 месяцы астрогу па абвінавачаньні ў «заклiку салдат непадначальвацца». Між паліцыяй і прысутнымі ў памяшканьні працаўнікамі здарылася стычка. Гайяр затрыман і адасланы ў астрог. Паліцэйскія зьбілі некалькі асоб, якія знаходзіліся ў памяшканьні.

Унітарная канфэдэрацыя працы, французская кампартыя і МОПР пратэстуюць проці ўчынкаў паліцыі, зазначаючы, што буржуазея і ўрад ня спыняюцца ні перад чым для разгрому рэвалюцыйных арганізацый. Унітарная канфэдэрацыя працы, унітарныя саюзы харчавікоў, будаўнікоў, мэталёўцаў, друкароў, тэкстыльшчыкаў, дзяржаўных служачых і землякопаў склікаюць мітынг пратэсту пад лёзунгамі: «на абарону правоў прафсаюзаў», „за скасаваньне подлых законаў“, «за ўсеагульную амністыю».

Антыфашысцкія дэманстрацыі бэрлінскіх рабочых.

СТЫЧКІ З ФАШЫСТАМІ.—НАСКОКІ ПАЛІЦЫІ НА ДЭМАНСТРАНТАЎ.

БЭРЛІН. 5-га лютага ў працэсіі фашысцкага „сталёвага шлему“ ўзяло ўдзел блізка 2.500 чалавек. Працэсія прайшла пад нясупыннаю аховаю паліцэйскага кардону.

Камуністычная партыя «чырвоны саюз франтавікоў» агаласілі адозву да працоўных Бэрліну з заклікам узяць удзел у 4-х контр-дэманстрацыях. Дэманстрацыі гэтыя прайшлі з вялікім уздымам пад знакам баявое гатоўнасьці. Вуліцы былі перапоўнены рабочымі, якія пратэставалі проці фашысцкае працэсіі і сьпявалі «Інтэрнацыянал». Здарылася некалькі стычак між рабочымі з аднаго боку і паліцыяй і ўдзельнікамі працэсіі «сталёвага шлему»—з другога. Бэрлінскі паліцэй-прэзыдэнт, сацыял-дэмакрат Цэргібэль ехаў у аўтамабілі на чале працэсіі «сталёвага шлему» і кіраваў наскокамі паліцыі на пратэстуючых рабочых.

Арыштавана 120 чалавек, у тым ліку некаторыя сябры чырвонага саюзу франтавікоў.

ШЛЯХ КАМІСІІ САЙМОНА ПАЛІТЫ КРЫВЁЮ.

ЛЁНДАН, 6-II. З Бамбею паведамляюць, што ў часе стычак у Бамбеі, Мадрасе і Калькуце было забіта 3 чалавекі, паранена 100 і арыштавана 200. Стычка ў Мадрасе была справакавана паліцыяй, якая накінулася на мірную дэманстрацыю.

Узмацненьне дыктатуры ў Літве.

«Кур'ер Віл.» паведамляе, што Вальдэмарас і яго партыя «таўцінікаў» канчаткова перамаглі сваіх унутраных праціўнікаў. Усіх сваіх праціўнікаў Вальдэмарас звальняе з урадавых пасад.

Польшча і Заходняя Беларусь перад выбарамі ў сойм.

ПАГРОЗА СКАСАВАНЬНЯ СЬПІСУ РАБ.-СЯЛ. АДЗІНСТВА Ў АКРУЗЕ.

ВАРШАВА, 6-II. У зьвязку з тым, што выбарчая камісія мае права разгледзець і скасаваць акруговыя сьпісы да 11-га лютага, у рабочых колах лічацца з магчымасьцю скасаваньня сьпісу рабоча-сялянскага адзінства ў некаторых акругах. Калі-б акруговыя сьпісы былі скасаваны, дык зацьверджаньне дзяржаўнага сьпісу ня мела-б ніякага практычнага значэньня. Ды і зараз, не зважаючы на зацьверджаньне сьпісу № 13, улада не дае ніякае магчымасьці праводзіць перадвыбарчую агітацыю за гэты сьпіс.

ДАЛЕЙШЫЯ АРЫШТЫ БЕЛАРУСАЎ У ВІЛЬНІ.

На загаду пракурорскай улады ў Вільні арыштованы: Пякач—старшыня «Бел. Раб.-Сял. Аб'яднаньня» і два члены «Аб'яднаньня»—Мітрафанаў і Кэпель.

Арышт б. пасла сойму кс. Окуня.

У Варшаве арыштован б. пасол сойму ксёндз Окунь—радыкальны-дзеяч, якога за яго пераконаньні вышэйшая духоўная ўлада яшчэ задоўга да гэтага пазбавіла духоўнага сану.

Новы літоўскі камітэт.

Пасьля выхаду з складу літоўскага к-ту д-ра Альсейкі і Валецкага адбыліся выбары новага прэзыдыуму к-ту. Старшынёю к-ту выбран П. Каразія, скарбнікам В. Будрэвічус і сэкратаром—Р. Мацкевічус.

Дутая фірма.

Не карыстаючыся ні павагай, ні ўплывамі сярод беларускіх мас заўлюкевічаўская дэфэнзыўная крамка зрабіла над ёю аграмадны шыльд з надпісам: „Цэнтральны Агульнабеларускі Народны Выбарчы Камітэт“, у які ўвайшлі такія дзеячы, як „князь“ Друцкі-Падбарэскі, „міністр“ Тодар Вярнікоўскі, Гасан-Канапацкі і інш.

У Беластоку падана 31 сьпісак.

У Беластоцкую акруговую выбарчую камісію падана аж 31 сьпісак кандыдатаў у сойм.

На першым месцы „беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам“ стаіць б. пасол сойму п. Палякевіч К.

КАНФІСКАЦЫІ:

«Сілы Працы».

1 лютага г. г. сканфіскавана новая радыкальная беларуская газэта „Сіла Працы“ (№ 1).

«Гэта—піша „Дз. Віл.“—орган б. грамадаўцаў, якія папярэднюю назву свайго органу „Думка Працы“ замянілі на назву «Сіла Працы»“.

«Сялянскай Нівы».

Урадавы камісар г. Вільні сканфіскаваў № 12 «Сялянскай Нівы»—органу Бел. сялянскага саюзу.

„Крыніцы“.

Урадавы камісар г. Вільні сканфіскаваў орган беларускіх хрысьціянскіх дэмакратаў-каталікоў—„Крыніцу“.

Кандыдаты ў сойм і сэнат:

Па Лідчыне.

Бел. сялянская партыя Я. Станкевіча выставіла па Лідчыне наступныя кандыдатуры: Я. Станкевіч, С. Валынец і М. Шакун. Беларуская сялянская партыя працы выставіла С. Лебовіча і інш. ППС выставіла Плаўскага і Станжэвіча. Агулам падана 20 сьпіскаў.

Па Вільні.

Блёк нацменшасьцяў выставіў па Вільні наступныя кандыдатуры: у сойм—Я. Выгодзкі (жыд) і Грабінскі Б. (беларус); у сэнат—В. Багдановіч і Ц. Шабад. Расейцы выставілі: у сойм—М. Беляўская і Бутурлін; у сэнат—Леляўскі Б. Бел. раб.-сял. аб'яднаньне у сойм—Назарук П., Пякач і Крук; у сэнат—Кэпель М.

Па Сьвянцяншчыне.

Блёк нацменшасьцяў выставіў па Сьвянцяншчыне наступныя кандыдатуры: Каруза, Стэновіч. Беларуская партыя працоўнага народу—Пяткевіча і Кавальчука. ППС—Плаўскага і Станжэвіча.

Па Навагрудчыне.

„Беларускае Работніцка-Сялянскае Аб'яднаньне“ выставіла на соймавым сьпісу па Навагрудчыне наступныя кандыдатуры: ТАРАШКЕВІЧ Б. (б. пасол), МЯТЛА П. (б. пасол), БУШЭВІЧ М. (настаўнік), ХОДЗЬКА К., КУЗЬМІЧ І. і інш.

Ад Блёку Нацменшасьцяў у сойм выстаўлена кандыдатура В. Рагулі, а ў сэнат таго-ж В. Рагулю і б. сэнатара В. Багдановіча.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ВІЛЬНІ.

4 лютага г. г. у Вільні адбыліся камуністычныя дэманстрацыі ў памяць гадавіны сьмерці Леніна. На рагу вуліц Серакоўскага і Надгорнай натоўп сабраўшыхся выкінуў тры сьцягі і была раздана камуністычная літаратура.

Паліцыя арыштавала 5 асоб. Вечарам натоўп зноў сабраўся, але паліцыя зноў разагнала дэманстрацыю.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ АНГЛІІ АДЧУВАЕ ПАТРЭБУ Ў ГАНДЛІ З СССР.

ЛЁНДАН, 7-II. Інфармацыйнае бюро прамысловых прадпрыёмстваў Нью-Кэстля і інш. прамысловых гарадоў Нортумбэрленда і Дэргэйма выпусьціла адозву, у якой, выкладаючы патрэбы гэтага раёну, патрабуе аднаўленьня нармальных гандлёвых зносін з СССР.

ТРАЦЕЙСКАЯ ПАСТАНОВА ПА КАНФЛІКТУ Ў САКСОНСКАЙ МЭТАЛЁПРАМЫСЛОВАСЬЦІ СКАСОВАНА.

БЭРЛІН, 7-2. Дрэздэнскі суд па працоўных справах ануляраваў абвешчаную нядаўна абавязковай трацейскую пастанову па канфлікту саксонскай мэталёпрамысловасьці аб увядзеньні на большасьці прадпрыёмстваў 10-цігадзіннага рабочага дню і скарачэньні надзельнага адпачынку.

Пастанова дрэздэнскага суду мае вялікае значэньне для перагляду такой-жа трацейскай пастановы па канфлікту ў Райнскай вобласьці і ў Вэстфаліі, які ахоплівае 220 тысяч рабочых.

Справа аб канфлікце ў Саксонскай мэталёпрамысловасьці разгледжана ў судзе на працоўных справах з прычыны таго, што саксонскія мэталёўцы ня спынялі баставаць, ня гледзячы на абавязковасьць трацейскай пастановы і супроць пастановы рэфармісцкіх прафсаюзаў.

АРЫШТ ЛІДЭРА ЮГАСЛАЎСКАГА СТУДЭНЦТВА.

ВЕНА, 2-II. Белградзкая «Палітыка» паведамляе пра арышт сэкратара студэнцкага марксысцкага саюзу ў Белградзе Мілютыновіча, абвінавачанага ў зносінах з кампартыяй. Як кажа газэта, пры вобыску ў Мілютыновіча знойдзены былі нумары часопісаў „Маладэ Бальшавік“, „Серп і Молат“ і «Чырвонае змаганьне». Мілютыновіч абвінавачан у камуністычнай прапагандзе. Судзіць яго будуць на падставе закону аб абароне дзяржавы.

За дзень.

„133“.

7 лютага г. г. у Беластоку пачаўся працэс 133 асоб, якіх польская дэфэнзыва абвінаваціла ў прыналежнасьці да кампартыі Зах. Беларусі. Абвінавачваюцца 133 асобы, але сярод іх знаходзіцца фігура правакатара Гурына-Маразоўскага, які прадаў рэшту абвінавачаных.

Дзеля праформы і віду Гурын таксама будзе сядзець на лаўцы абвінавачаных, каб даць магчымасьць суду разыграць камэдыю.

Як і ўсе іншыя працэсы ў цыклю «антыдзяржаўных» і гэты працэс 133 датычыць справы беларускага адраджэнчага руху, зьвязанага з шырокім работніцка-сялянскім рухам. Сярод абвінавачаных амаль што палова работнікі, рэшта—сяляне; ёсьць і беларуская інтэлігенцыя.

Усіх іх абвінавачваюць у тым, быццам яны саставілі загавор проці польскай дзяржавы і імкнуліся адарваць Зах. Беларусь ад Польскай рэспублікі.

Гэта было яшчэ ў 1925 г. Тады пачаўся і адбываецца да нашых дзён пагром кампартыі Зах. Беларусі. Перад гэтым дэфэнзыва апрацавала падрабязны плян «ліквідацыі» кампартыі Зах. Беларусі і спэцыяльна падгатавала для гэтага канцэнтрацыйныя лягеры для арыштаваных, якіх чакаліся тысячы. Арыштована было некалькі тысяч беларусаў.

І вось да сёньняшняга дня сядзяць у вастрогах 133 асобы. Адзін толькі правакатар Гурын гуляе па Вільні і разам з Умястоўскім выдае дэфэнзыўную газэту «Беларускі Дзень», у якой выхваляе шчасьце беларускага народу пад уладай польскіх паноў.

Ад восені 1925 г. да апошняга часу шмат хто з арыштаваных памёр, звар'яцеў, захварэў на сухоты, стаўся інвалідам. За бездаказанасьцю віны многіх павыпушчалі з вастрогаў. Засталося толькі 133 і правакатар Гурын.

Беластоцкі працэс, як і іншыя з цыклю беларускіх «антыдзяржаўных» працэсаў, нічога новага не прынясе апрача новых прысудаў над новымі людзьмі, вінаватымі толькі ў тым, што яны лічаць Зах. Беларусь сваёю бацькаўшчынай, падняволенай панскай Польшчы і ёю прыгнечанай.

Кантрабандны правоз зброі і шчыліны ў Малой Антанце.

Справа аб кантрабандным правозе зброі з Італіі ў Вэнгрыю заглохла. Малая Антанта зьбіралася падаць у Лігу Нацый калектыўную скаргу на Вэнгрыю і патрабаваць суровага расьсьледваньня гэтае справы. Аднак, у апошнюю хвіліну Румынія зьняла свой подпіс з заявы Малой Антанты. Румынія пад націскам Францыі ўсё-ж прымушана была выступіць з самастойнай нотай «пратэсту». Аднак, нота, зложаная ў вельмі далікатных выразах, усяляк затушоўвае ролю Італіі ў гэтай справе. Бязумоўна, гэты крок тлумачыцца націскам Італіі, з якой Румынія ў сучасны момант вядзе перагаворы, пры чым румынскі міністр замежных спраў Цітулеску сам знаходзіцца ў Рыме.

Францускі дыплёматычны штотыднёвік «Эроп Нувэль» не бязьхітрасьці намякае на тое, што выкрыцьцё, якое магло-б быць у выніку расьсьледваньня справы аб кантрабандзе зброі, было вельмі няпрыемным ня толькі для Італіі і для Румыніі, але і для Англіі асабліва «для тых шматлікіх прыяцеляў, якіх вэнгерскі ўрад мае ў розных колах ангельскай грамады».

Мы даскакала ведаем, што гэтыя «прыяцелі Вэнгрыі» ніхто іншы, як рэдактар «Дэйлі Мэйль» і глава буйнага чорнасоценнага газэтнага трэсту лёрд Ротэрмір. Такім чынам, орган францускага міністэрства замежных спраў проста намякае на тое, што дастаўка Вэнгрыі зброі справа ня толькі Італіі, але і Англіі. Часопіс упэўнен у тым, што Ліга Нацый не змагла-б разабрацца ў гэтай справе і Вэнгрыя яшчэ раз выйдзе сухою з вады дзякуючы разгалосьсям сярод вялікіх і малых дзяржаў Эўропы.

У гэтым выпадку мы прымушаны зусім згадзіцца з францускімі дыплёматамі.

ПРАТЭСТ СУПРОЦЬ РАСПРАВЫ НАД БЕЛАРУСКАЙ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ГРАМАДОЙ.

Працоўныя Савецкай Беларусі рашуча пратэстуюць супроць расправы фашыстаўсткага польскага ўраду над Беларускай рабоча-сялянскай Грамадой.

Так, АГУЛЬНЫ СХОД СТУДЭНЦТВА РАБФАКУ БДУ у сваёй рэзалюцыі заяўляе, што гісторыя чалавецтва яшчэ ня ведае такога ўціску, у якім знаходзяцца працоўныя Заходняе Беларусі ў панскай Польшчы пад уладай Пілсудзкага, і рашуча пратэстуюць супроць зьдзеку над правамі беларускіх рабочых і сялян. Студэнцтва заклікае ўсіх працоўных Савецкага Саюзу ўзьняць свой голас пратэсту супроць судовай расправы над Беларускай Грамадой, якая бараніла законныя правы беларускай насельнасьці ў межах Польшчы.

3-я КАНФЭРЭНЦЫЯ МОПРУ АКЦЯБРСКАГА РАЙЁНУ г. МЕНСКУ працэс над Беларускай Грамадой лічыць пачаткам абдуманага пляну польскага фашызму ў барацьбе з нарастаючым рэвалюцыйным рухам у Заходняй Беларусі, і што гэты суд зьявіцца расправай над працоўнымі Заходняе Беларусі наогул.

Канфэрэнцыя рашуча пратэстуе супроць гэтага новага гвалту над адвечнымі жыхарамі Заходняе Беларусі—беларускімі рабочымі і сялянамі.

Польшча перад 4 сакавіка.

Перадвыбарчы сэзон у Польшчы распачаўся. На 4-га сакавіка назначаны выбары ў сойм, які, як вядома, перабіраецца па польскай канстытуцыі раз у 5 гадоў. Перадвыбарчая кампанія зараз у самым распале. Да перавыбараў пададзена ўжо 33 сьпісы розных партый і груповак.

Пілсудзкі імкнецца сабраць навакол сябе ўсе магчымыя сілы. І сілы навакол Пілсудзкага кансалідуюцца. Гэта—сілы буржуазеі і абшарнікаў. І тыя і другія адчуваюць, што за сьпіною маршала ім будзе цяплей жыць і таму ня дзіва, што нават апазіцыйныя да гэтага часу старшыня польскага саюзу прамысловцаў Андрэй Вяржбіцкі і старшыня саюзу аграрыяў (абшарнікаў) Як Стэцкі таксама далучыліся да «адзінага фронту» пілсудчыкаў.

19-га сьнежня зьявілася адозва прадстаўнікоў гаспадарчых колаў, падпісаная, між іншым, і памянёнымі Вяржбіцкім і Стэцкім. Іншыя подпісы належаць выдатнейшым прадстаўнікам прамысловага і гандлёвага капіталу і фінансістаў. Гэты дакумант—скрозь пахвальба ўсёй дзейнасьці Пілсудзкага. Польскія буржуа ўсхваляюць Пілсудзкага, фармулююць свае патрабаваньні, хутчэй—сваю праграму, якая ў галоўным патрабуе: пашырыць уладу прэзыдэнта рэспублікі і абмежаваць ролю сойму пры дапамозе сэнату (ў сэнат уваходзяць прадстаўнікі гаспадарчых арганізацый, духоўніцтва, вышэйшых навучальных установ і асабова назначаныя ўрадам). Адозва польскай буржуазеі заклікае ўсіх бяз выключэньня да салідарнасьці, якая процістаўляецца клясавай барацьбе.

Не засталіся сядзець моўчкі перад Пілсудзкім і польскія папы. Перад намі цікавы дакумант: «Адозва каталіцкіх біскупаў». Героі «крыжа і маузэра» ў сваёй адозьве заклікаюць да барацьбы з камунізмам, аб'яднаньня ўсіх каталікоў і да актыўнага ўдзелу ў выбарах...

Польскі ўрад выказвае вельмі вялікую „актыўнасьць“ у справе падрыхтоўкі выбараў. Актыўнасьць польскага ўраду ідзе па двух напрамках: папершае, урад паставіў сваёй задачай разграміць і паслабіць усе апазіцыйныя партыі і, падругое, ён рашыў абавязкова скласьці свой урадавы блёк. Фактычна гэты блёк ужо ўдалося скласьці. Ён будзе выступаць на выбарах пад фірмаю «беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам» (сьпіс № 1). Публіка ў гэтым блёку падабралася самая разнастайная: тут і партыя вярцы, адным з лідэраў якой зьяўляецца сучасны віца-прэм'ер Бартэль, тут і фашысцкая арганізацыя пілсудчыкаў «Саюз аздараўленьня рэспублікі», сюды-ж уваходзяць і розныя кансэрватыўна-манархічныя групоўкі.

Асабліва непакоіцца польскі ўрад за перадвыбарчы рух сярод нацыянальных меншасьцяў на Ўсходніх крэсах. І тут урад ухваліў стварыць адзіны фронт усіх польскіх партый проці нацыянальных меншасьцяў.

Урад спрабуе раскалоць нацыянальныя меншасьці, выкарыстоўваючы нават іх рэлігію. Для таго, каб падлабуніцца да цёмных яўрэйскіх мас Галіцыі, Пілсудзкі зрабіў такую штуку: ён дазволіў склікаць у Галіцыі зьезд яўрэйскіх рабінаў. Паважаны сход быў абстаўлен вельмі ўрачыста. Прысутных яўрэяў-старцаў вітаў сам галіцыйскі ваявода Дунін-Баркоўскі, а аднаго, асабліва мудрага старога яўрэя, які ехаў на рабінскі зьезд, праводзіла нават паўэскадрона паліцыі.

Урад усімі сіламі імкнецца разьбіць блёк нацыянальных меншасьцяў. Гэты блёк складаецца з яўрэйскіх сіяніцкіх арганізацый, украінскіх нацыянал-дэмакратаў, самай моцнай партыі Усходняй Галіцыі аб'яднаньня «Ундо», беларуска-сялянскага саюзу, літоўскай і іншых нацыянальных арганізацый. Агенты Пілсудзкага спрабуюць унесьці разлад у блёк праз падбухторства яўрэяў проці ўкраінцаў.

— Вы ідзеце з тымі, дзе правадыром быў пагромшчык Пятлюра!—заклікаюць пілсудчыкі яўрэяў.

— Вы ідзеце з тымі, хто высунуў Шварцбарда, забойцу Пятлюры!—угаварваюць пілсудчыкі ўкраінцаў.

Гэта выкарыстаньне нацыянальнай варожасьці між украінскай і яўрэйскай буржуазеяй дало некаторыя вынікі. Ад блёку нацыянальных меншасьцяў адмяжэпілася аб'яднаньне галіцыйскіх сыяністаў, што, натуральна, крыху паслабіла блёк, але ўсё-ж такі блёк нацменшасьцяў пойдзе на выбары ў сваім сьпісам. Бяручы гэта пад увагу, урад хоча процістаўляць блёку «свае» нацыянальныя меншасьці, арганізацыі якіх энэргічна насаджваюцца сродкамі дэфэнзывы (ахранкі). Такія ліпавыя арганізацыі ўжо створаны.

Для перамогі палякаў на крэсах урад да таго стараецца, што перакройвае нават акругі. Гэта своеасаблівае «райёнаваньне» таксама накіравана да таго, каб рашчапіць сілы нацыянальных меншасьцяў.

Што датычыць іншых партый, дык эндэкі выступаюць пад фірмаю нацыянальна-каталіцкага блёку. Хрысьціянскія дэмакраты (хадэкі) і кулацкая партыя „Пяст“ выступаюць разам пад назваю «польска-каталіцкага блёку». ППС выступае асобна і толькі ў Верхняй Сілезіі і Лёдзі блёкуецца з нямецкімі сацыялістамі. Левыя-ж рабоча-сялянскія арганізацыі маюць ва Ўсходняй Галіцыі і Валыні сьпіс «Сельроб», а на беларускіх землях—«Рабоча-сялянскае беларускае аб'яднаньне», у якім фігуруе і камуніст Варскі.

Ці дапусьцяць камуністаў да выбараў? Урад можа, у выпадку павялічэньня ўплыву камуністаў, скасаваць сьпісы, у якіх яны высунуты, як гэта было зроблена ў часе выбараў у муніцыпалітэты.

Але калі разгрому ня будзе, хоць усё сьведчыць, што разгром падрыхтоўваецца, дык трэба чакаць значнага павялічэньня рабоча-сялянскіх дэпутатаў сойму.

І проці гэтага блёку, проці будучых дэпутатаў рабоча-сялянскай часткі Польшчы зараз накіравана цяжкая артылерыя пілсудчыкаў: тэрор, масавыя судовыя расправы і іншыя сродкі вядомай дэфэнзывы. Усім польскім дзяржымордам загадана ў гэтыя дні напатужыцца і павялічыць у 10 раз сваю карысную дзейнасьць.

Якім-жа будзе новы сойм? Судзячы па ўсіх даных, большасьць у сойме будзе забясьпечана пілсудчыкам. Але яны зьяўляюцца такою разнастайнаю масаю, што наўрад ці надоўга здолеюць захаваць адзінства. Супярэчнасьці ўнутры кіруючай партыі не павялічаць аўтарытэту сойму.

Для рабоча-сялянскай-жа часткі Польшчы перадвыбарчыя дні і дзень 4-га сакавіка будуць толькі чарговаю навукаю клясавае барацьбы.

М. Ю.

ЗАГАТОЎКІ ХЛЕБА І СЫРАВІНЫ.

Спажывецкая каапэрацыя за студзень загатовіла на 635. 000 руб.

Працу па загатоўках хлеба і сыравіны вясковая спажывецкая каапэрацыя разгарнула належна толькі з 10-12 студзеня. Дзякуючы выезду на месцы шэрагу адказных працаўнікоў і прыцягненьню да справы ўзмацненьня загатовак усяго каапэрацыйнага актыву, студзень даў больш-менш станоўчыя вынікі.

Так, за ўвесь студзень спажывецкая каапэрацыя загатовіла розных хлебных культур 180743 пуд., ці палову таго, што было загатоўлена за час з ліпеня па студзень.

Зрухнулася таксама і загатоўка сыравіны: лёну і кудзелі загатоўлена на 51.000 руб., скураной сыравіны—на 70.000 руб. і рознай экспартнай сыравіны—на 220.000 руб. Такім чынам, спажывецкая каапэрацыя ў студзені загатовіла хлеба і сыравіны на 635 тысяч руб.

Цікава адзначыць, што за першыя 2 дэкады студзеня ўсе загатоўкі дасягнулі 298.000 руб. Адгэтуль відаць, што ў апошнія дзесяць дзён загатоўлена больш, чым за першыя дзьве дэкады амаль на 150 проц.

Пакуль што цягнуцца ў хвасьце ў загатоўчай працы Гомельскі і Віцебскі акр. спаж. саюзы, але ўжо і там адчуваецца некаторае ажыўленьне.

Трэба адзначыць, што за апошнюю дэкаду ўзмацніліся загатоўкі буйнай скураной сыравіны, у якой адчувае недахват наша прамысловасьць. Загатоўка экспартнай сыравіны ў студзені дае выкананьне на 27 проц. гадавога пляну, а заданьне на студзень выканана на 150 проц.

Горш стаіць справа з хлебазагатоўкамі. Так, у студзені выканана толькі 20 проц. гадавога пляну замест атрыманага заданьня ў 30 проц. У адносінах загатовак хлебных культур ускладаецца надзея на люты—сакавік, бо гэтыя месяцы павінны будуць асабліва спрыяць загатоўкам.

Запасы экспартнай сыравіны зараз прыводзяцца ў ліквіднае становішча і часткова ўжо накіраваны заграніцу.

У заключэньне трэба сказаць, што зараз загатоўкі спажывецкай каапэрацыі павінны будуць узмацніцца, бо Нар. Кам. Гандлю СССР дазволіў спажывецкай каапэрацыі весьці загатоўку шчаціны і конскага воласу.

У сувязі з уцягненьнем у загатоўчую працу вялікай колькасьці спажывецкіх таварыстваў, якія ў большасьці раней яе не вялі, фінансаваньне адчувала некаторыя цяжкасьці. Зараз праўленьне Белкаапсаюзу прыняло шэраг мерапрыемстваў, і трэба спадзявацца, што ў бліжэйшы час фінансаваньне палепшыцца.

Належнага пералому ў загатоўках сел.-гаспадарчай каапэрацыі студзень ня даў.

Да гэтага году сыстэма сельска-гаспадарчай каапэрацыі ў загатоўках прымала вельмі нязначны ўдзел, а некаторых культур і зусім не загатаўляла. Уся праца каапэрацыі, галоўным чынам, ішла па лініі крэдытаваньня і забясьпечаньня.

Толькі з пачатку 1927-28 гаспадарчага году каапэрацыя выступіла на рынак у якасьці асноўнага загатоўцы с.-гасп. прадуктаў і рознай сыравіны. З гэтай прычыны, апарацыйны апарат усёй сыстэмы с.-гасп. каапэрацыі быў слаба падрыхтаваны як з колькаснага, так і якаснага боку, што, зразумела, не магло не адбіцца на разгортваньні загатоўчай працы.

Дзякуючы ўжытым мерам, ужо ў І квартале дасягнуты значны пералом у павялічэньні ўдзельнай вагі с.-гасп. каапэрацыі ў загатоўках.

Згодна пляну, у першым квартале сыстэма с.-гасп. каапэрацыі павінна была загатовіць розных прадуктаў і сыравіны на 2.486.295 руб., а загатоўлена па няпоўных вестках ужо на 2.485.915 руб. Такім чынам, можна лічыць загатоўчы плян выкананым.

Аб загатоўках у студзені пакуль што можна гаварыць за 2 дэкады, бо як нізоўка, так і акрсельсаюзы ня прынялі належных мер да поўнага і своечасовага вучоту загатоўчай работы.

Водлуг даных за студзень, сыстэма с.-гасп. каапэрацыі выканала па ўсіх відах загатовак 22 проц. квартальнага заданьня, а гэта стварае пагрозу невыкананьня пляну.

Так, лёну-валакна па пляну трэба за квартал загатовіць 1927 тон, а ў студзені загатоўлена толькі 376 тон; ільнянага семя загатоўлена 197 тон, а квартальнае заданьне 1195 тон. Між тым, у першым квартале ільнянага валакна загатоўлена 104 проц. заданьня, а семя 70 проц.

Такім чынам, хоць даныя яшчэ і няпоўныя, але ўжо можна ўбачыць падзеньне тэмпу загатовак у параўнаньні з І кварталам.

Як-жа стаіць справа з іншымі загатоўкамі?

Жыта загатоўлена ў студзені 110 тон, аўса 158 тон і ячменю 61 тона, буйнай скураной сыравіны 2600 штук, а ў І кв. 12595, дробнай—4924, а раней—18539 штук. Рознай-жа іншай сыравіны загатоўлена на 263570 р. Уся-ж загатоўка водлуг няпоўных даных складае суму 569168 руб., што дае выкананьне пляну на студзень на 77 проц.

Наогул, дзьве дэкады студзеня ня ўнесьлі належнага пералому ў ходзе загатовак па ільнянаму валакну і семю, а таксама і па хлебных культурах, нават ёсьць зьніжэньне тэмпу загатовак у параўнаньні з першым кварталам.

Тлумачыцца гэта тым, што большая частка часу дзьвюх дэкад пайшла на арганізацыйную падрыхтоўку апарату, а, падругое, адсутнасьць сталага вучоту не адбівае сапраўднага малюнку загатовак. Невялікі час сэзону, які застаўся для загатовак, трэба скарыстаць выключна на практычную загатоўчую працу, каб выканаць заданьне.

Перашкоды зьнішчаем.

По сваім эканамічным становішчы Кохаваўскі раён можа даць шмат як хлеба-прадуктаў, так і іншай сыравіны, толькі неабходна зьвярнуць на гэта належную ўвагу.

Але, ня гледзячы на ўсе спрыяючыя ўмовы, загатоўкі льну дасюль разьвярнуліся ня зусім здавальняюча. Справа ў тым, што і РВК, і Дняпрасаюз, і акрсельсаюз не завастрылі ўвагі на гэтым важным пытаньні.

Былі і такія выпадкі, што адпушчаныя на загатоўку грошы скарыстоўваліся на іншыя патрэбы.

Рынак амаль да апошняга моманту знаходзіўся ў руках прыватнікаў-спэкулянтаў: Кісіна, Каждана, Вэбэра, Гофмана і інш., у якіх знойдзена шмат запасаў хлеба.

Пасьля адхіленьня з рынку гэтых спэкулянтаў справа загатовак наладзілася.

С.

10.000 руб. на мясазагатоўкі.

ВІЦЕБСК, 4-ІІ. З Менску сёньня пераведзена акруговаму сельска-гаспадарчаму крэдытнаму таварыству 10.000 руб. кароткатэрміновага крэдыту на загатоўку мяса. Загатоўка будзе праводзіцца праз нізавую сетку сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

ЭКСПОРТ СМАЛАПРАДУКТАЎ.

На днях беларускі саматужна-прамысловы саюз адпраўляе за межы 50 тон смалапрадуктаў. Гэта будзе першая партыя, якая адпраўляецца беларускім саматужна-прамысловым саюзам.

Загатоўкі ў Бабруйшчыне.

(Па тэлефону ад уласнага карэспандэнта)

БАБРУЙСК, 7-ІІ. Вынікі хлебазагатоўчае працы па акрузе за студзень паказваюць, што заданьне за студзень па загатоўках хлеба выканана на 38 проц. і льнянога семя на 36 проц. Усяго за студзень м-ц загатоўлена 1101 тона збожжа. З гэтае лічбы 1040 тон загатоўлена за другую палову студзеня. Льнянога семя за студзень загатоўлена 150 з палов. тон.

Вельмі адсталі па загатоўцы Любаньскі і Старадарожскі раёны. Першы выканаў заданьне за студзень усяго на 3 проц., другі на 7 проц.

Парыцкі і Жлобінскі раёны ідуць першымі па загатоўках. Яны выканалі 90 проц. заданьня за студзень.

Адзначаецца слабы прывоз хлеба на рынак сялянамі, і гэтыя загатоўкі шлі за кошт рэгуляваньня прыватнага рынку.

Наглядаецца няхват на мясцох прамысловых тавараў; акрсаюз павінен быў выкінуць на вёску 2 з палов. вагоны тавараў (мануфактуры), а выкінуў усяго 1 вагон. Зазначаецца разнабой у цэнах між асобнымі відамі каапэрацыі, а таксама зазначаецца, што каапэрацыя скарыстоўвае прыватніка ў якасьці агентаў па загатоўках. Асаблівы разнабой у цэнах наглядаецца ў Рагачоўскім раёне.

Загатоўка валакна і льнянога семя.

(З пасяджэньня Савету Народных Камісараў БССР 4 лютага 1928 г.)

4 лютага на пасяджэньні СНК быў выслуханы даклад Народнага Камісара Гандлю тав. Адамайціса і паведамленьні старшыні беларускага саюзу каапэрацыйных арганізацый т. Наўлянскага, старшыні беларускага сельска-гаспадарчага саюзу т. Аксючыца і намесьніка старшыні Белдзяржгандлю т. Лубужа аб ходзе загатовак валакна і льнянога семя. СНК адзначыў, што паводле даных Народнага Камісарыяту Гандлю ў першым квартале 1927-28 г. заданьне па загатоўках лёну выканана ў разьмеры 30 проц. агульнага пляну, у студзені бягучага году 13 проц. гэтага пляну, а ўсяго за 1 лютага г. г. выканана 43 пр. гадавога пляну, што характарызуе зусім нездавальняючы ход загатовак у 1-м квартале і далейшае зьмяншэньне тэмпу загатовак у студзені месяцы.

Для ўзмацненьня загатовак валакна (лёну, пянькі і кудзелі) і льнянога семя і для зьмяншэньня асяданьня яго ў вёсцы, Народнаму Камісарыяту Фінансаў і акруговым выканаўчым камітэтам даручана ўзмацніць спагнаньні, асабліва ў разводзячых лён раёнах, якія належаць з сялянства, у тым ліку і па самаабкладаньні. Народнаму Камісарыяту Фінансаў і акруговым выканаўчым камітэтам даручана таксама на працягу лютага і сакавіка месяцаў спагнаць ня менш 70 проц. належачых паступленьняў па самаабкладаньні сум.

Пастаноўлена забясьпечыць сялян-здатчыкаў валакна і льнянога семя асноўнымі прамысловымі таварамі (мануфактураю, скуранымі, мэталёвымі, шклом і інш.) з тым, што гэтыя тавары абавязкова будуць адпускацца з гатовага запасу, а калі яго ня будзе, то забясьпечыць выдачу гэтых тавараў не пазьней 2-х месяцаў ад дня здачы валакна і льнянога семя. Разьмер выдачы прамысловых тавараў вызначаны для Менскай, Бабруйскай і Гомельскай акруг у 70 проц. кошту здаванага валакна і семя, а ў разводзячых лён раёнах, дзе апрач прамысловых тавараў выдаецца яшчэ і збожжа, вызначыць выдачу прамысловых тавараў у разьмеры 50 проц. здаванага валакна і льнянога семя.

З агульнай колькасьці збожжа, якое паступае для забясьпечаньня вёскі, пастаноўлена вызначыць для прамысловых разводзячых лён раёну першай групы каля 70 проц., а ў іншых разводзячых лён раёнах 50 проц. збожжа, што паступае для продажу здатчыкам валакна і льнянога семя паводле нормы Народнага Камісарыяту Гандлю, рэшту збожжа прадаваць бяднейшаму насельніцтву. Выдача збожжа і прамысловых тавараў здатчыкам валакна і льнянога семя ўскладзена на спажывецкую каапэрацыю з тым, каб продаж рабіўся тым сялянам, якія будуць мець квітанцыі дзяржаўных загатоўчых пунктаў або каапэрацыйных загатоўшчыкаў, што пасьведчаюць колькасьць здадзенага валакна альбо семя.

Адначасна, СНК, бяручы пад увагу тое, што ў некаторых сялян валакно знаходзіцца ў сырым, яшчэ неапрацаваным, відзе, прызнаў патрэбным, каб загатоўшчыкамі практыкавалася заключэньне індывідуальных дагавораў з сялянамі на дастаўку апошнімі гатовага валакна ў тэрмін ня больш 2 месяцаў, дазваляючы пры гэтым выдачу задаткаў да 20 процант. кошту валакна.

Прызнаючы, што паступленьне закантрактаванага лёну нездавальняючае, СНК адзначыў, што прычынаю гэтаму зьяўляецца з аднаго боку ўхіленьне насельніцтва ад выкананьня сваіх абавязкаў, а з другога—няўжыцьцё адпаведных захадаў уплыву з боку сельска-гаспадарчай каапэрацыі да спагнаньня закантрактаванага лёну. На Беларускі Сельска-Гаспадарчы Саюз пад пэрсанальную адказнасьць старшыні кіраўніцтва т. Аксючыца ўскладзены абавязак скончыць у лютым месяцы поўнае спагнаньне закантрактаванага лёну.

Акруговым і раённым выканаўчым камітэтам зазначана, што асноўнаю задачаю ў галіне загатовак у разводзячых лён раёнах зараз зьяўляецца работа на загатоўцы валакна і семя і што люты месяц зьяўляецца ў гэтых адносінах рашаючым.

За слабую работу і няўжыцьцё патрэбных захадаў да разьвіцьця загатовак валакна і семя, а таксама за няўжыцьцё захадаў да спагнаньня закантрактаванага лёну пастаноўлена абвясьціць выгавар з апублікаваньнем у друку Кіраўніцтвам Полацкага і Віцебскага Акруговых Сельска-Гаспадарчых Саюзаў. За слабую работу і за няпрыняцьце службовых захадаў да разьвіцьця загатовак лёну СНК абвясьціў выгавар Загадчыку Аршанска-Магілеўскага Аддзяленьня Белдзяржгандлю тав. Прэсбургеру і Загадчыку Полацкага Агенцтва Белдзяржгандлю тав. Рэбекелю.

Беларускаму Сельска-Гаспадарчаму Саюзу запрапанавана зьняць з пасады і прыцягнуць да судовай адказнасьці за няўжыцьцё ўсіх захадаў да спагнаньня закантрактаванага лёну Старшынь Сіропінскага і Езярышчанскага Сельска-Гаспадарчых Таварыстваў Віцебскай акругі. На Народны Камісарыят Гандлю ўскладзены абавязак не паслабляць увагі да загатоўчай работы і забясьпечыць рэгулярнае атрыманьне справаздач ад арганізацый аб ходзе загатовак. Асаблівую ўвагу запрапанавана зьвярнуць на слабую работу загатоўчых арганізацый Віцебскай і Магілеўскай акруг, у сувязку з чым СНК даў дырэктыву а[illegible]ьцы з работы і прыцягненьні да [illegible] работнікаў, ня ўжыўшых слу[illegible] захадаў

Спэцыялісты с. гаспадаркі дапамогуць партыі ў вырашэньні важных задач.

(З прамовы т. Кнорына на усебеларускай нарадзе зямельных працаўнікоў).

Ці будуць дробныя гаспадаркі заўсёды дробнымі.

Я хацеў-бы выкарыстаць прадастаўленае мне слова дзеля таго, каб падкрэсьліць некалькі палажэньняў, якія, па маёй думцы, павінны ляжаць у аснове вашай працы.

Наша палітыка змагла прыпыніць абядненьне вёскі; яна дала пэрспэктывы бяднейшым пластом сялянства ў справе спыненьня ўпадку іх гаспадаркі. Іх шлях да сацыялізму можа ляжаць не праз пралетарызацыю, а праз каапэраваньне, праз падняцьце іх бядняцкай гаспадаркі.

Ужо цяпер мы можам устанавіць, што сярэдні слой сялянства—серадняцкі слой—усё пашыраецца за рахунак паляпшэньня становішча бядняцкай бясконнай гаспадаркі.

Але перад намі цяпер паўстае ўжо другая праблема: ці можа наша сялянская гаспадарка вечна быць у такім выглядзе, у якім яна знаходзіцца зараз? Мы адказваем: малая, раздробленая сялянская гаспадарка будзе праз нейкі час гістарычным перажыткам; малая, раздробленая гаспадарка ёсьць і будзе асноваю кансэрватызму, яна будзе стрымліваць узьдым агульнага ўзроўню чалавека, які працуе на сельскай гаспадарцы, будзе падтрымліваць старую сялянскую абмежаванасьць.

Нашай задачай не зьяўляецца захаваць навекі дробную сялянскую гаспадарку. Нашай задачай зьяўляецца барацьба за тое, каб аб'яднаньне сялянскай гаспадаркі, пашырэньне яе, пераход да буйнай калектыўнай сельскай гаспадаркі пайшоў ня шляхам згуртаваньня капіталістычных і кулацкіх элемэнтаў вёскі, каб гэта прайшло ня шляхам прымусовага выкідваньня з сялянскай гаспадаркі слаёў бядняцкіх і тых, што бяднеюць,—гэта трэба рабіць шляхам нармальнага разьвіцьця вёскі, шляхам усё большага і большага ўцягваньня сялянства ў калектывы, шляхам каапэраваньня ўсёй масы бядняцкай і серадняцкай вёскі.

Нашы два лёзунгі.

Грунтуючыся па гэтых прынцыповых палажэньнях, мы высунулі два лёзунгі для цяперашняга часу. Першы з іх—**узмацніць увагу да калектывізацыі сялянскае гаспадаркі.** Гэта праца да апошняга часу, асабліва за апошнія два гады, ня была ў асяродку ўвагі. Мы павінны сказаць, што шэраг няўдалых вопытаў моцна пашкодзіў гэтай працы. Мы высоўваем гэты лёзунг цяпер дзеля таго, каб са ўсёй сур'ёзнасьцю працаваць над ім, дзеля таго, каб у далейшай працы ўсё больш і больш прыцягваць шырокія масы сялянства па іх добрай волі, бяз ніякага прымусу да грамадзкіх калектыўных формаў сельскае гаспадаркі, бо толькі гэта адчыніць магчымасьць дастасаваньня лепшай тэхнікі ў сельскай гаспадарцы.

Другі лёзунг—**пагалоўнае каапэраваньне ўсяго сялянства.** XV зьезд УсеКП(б), які адбыўся два месяцы таму назад, даў нам канкрэтнае заданьне на бліжэйшыя два гады: павесьці працу так, каб у працягу бліжэйшых год дамагчыся аб'яднаньня ў спажывецкай і с.-г. каапэрацыі пераважнай большасьці бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак.

Аснова асноў.

Таварышы! Мы грунтуемся, як на асноўным прынцыпе, на неабходнасьці падняцьця вытворчых сіл вёскі. Гэта—аснова асноў. Мы грунтуемся на тым, што беларуская гаспадарка павінна даць сыравіну нашай прамысловасьці. Задачы вытворчасьці вымагаюць дастасаваньня да сельскай гаспадаркі больш кваліфікаваных сіл, яны патрабуюць павышэньня агульнага ўзроўню сялянскай гаспадаркі. Бяз гэтага яны ня могуць быць вырашаны. Прапаганда найпрасьцейшых агранамічных ведаў у вёсцы, навучаньне селяніна, як перайсьці да больш высокіх формаў гаспадаркі, як лепш выкарыстаць сваю працу,—палітычная задача сучаснага моманту, задача надзвычайнай важнасьці.

Зямельныя працаўнікі дапамогуць вырашыць важную задачу.

Я думаю, што ваша праца будзе адыгрываць тым больш значную ролю, што мы зараз прыступаем да практычнага вырашэньня тых агульных задач, якія перад намі, перад усёй краінай, перад савецкаю ўладаю былі пастаўлены XV зьездам УсеКП(б).

У бліжэйшы час у партыйных органах Беларусі будзе вырашацца пытаньне аб шляхох выкананьня гэтых агульных палітычных задач, якія стаяць перад намі ў галіне арганізацыі сельскай гаспадаркі.

Я спадзяюся, што мы шырока зможам выкарыстаць пастановы вашай нарады і ваш буйны і важны вопыт.

Канчаючы, я хачу выказаць яшчэ толькі адно меркаваньне: усе нашы партыйныя арганізацыі, уся савецкая і партыйная грамадзкасьць у бліжэйшы час павінна будзе паставіць у асяродку ўвагі пытаньне аб сельскай гаспадарцы, аб арганізацыі сельскай гаспадаркі.

Я выказваю надзею, што зямельныя работнікі, аграномы, усе спэцыялісты сельскай гаспадаркі, уся савецкая грамадзкасьць дадуць у гэтай справе сур'ёзную дапамогу нашай партыі, што яны—асноўныя работнікі, на якіх у гэтай справе абапіраецца савецкая дзяржава, будуць іսьці ў авангардзе ў справе вырашэньня задач, вызначаных нашай партыяй (воплескі).

Практычныя шляхі беларусізацыі.

Прэзыдыум Савету Нацыянальнасьцяў ЦВК СССР заслухаў даклад Прэзыдыуму ЦВК БССР аб ажыцьцяўленьні беларусізацыі. ЦВК БССР распрацован цэлы шэраг мерапрыемстваў, якія павінны дапамагчы ажыцьцяўленьню ўхваленых пастаноў, галоўным чынам у напрамку разгортваньня культурнай рэвалюцыі на Беларусі. Зусім слушна, што пытаньні пісьменнасьці і культурнага ўзроўню нашае насельнасьці адыгрываюць вялізарную ролю ў агульным сацыялістычным будаўніцтве нашае краіны і яе адраджэньні і на гэты бок справы трэба зараз зьвярнуць значную ўвагу; але перш, чым перайсьці да разгляду нашых дасягненьняў, патрэб і недахватаў у гэтай галіне працы, трэба крыху спыніцца на тых прадпасылках, якія патрэбны для больш пасьпяховага вырашэньня стаячых перад намі задач.

Пленум ЦК КП(б)Б у сваёй рэзалюцыі ад студзеня 1925 г. па пытаньні аб чарговых задачах КП(б)Б у нацыянальнай палітыцы кажа, што «асноўным пытаньнем беларусізацыі зьяўляецца пытаньне аб беларускай мове». Для партыі ясна было, што пралетарыят ня можа кіраваць пераважнай большасьцю насельніцтва БССР—беларусамі, ня ведаючы беларускае мовы. Партыя высунула пытаньне аб мове ў першую чаргу, бо правільна зазначыў тав. Кнорын на XI зьезьдзе КП(б)Б, што

«жалкім бюракратам і чыноўнікам [illegible] хто думае абыйсьціся бяз веданьня беларускае мовы, хто думае размаўляць з масамі, якія гавораць пабеларуску, не на іх роднай мове».

Вось чаму пытаньне беларусізацыі нашых савецкіх, партыйных, каапэрацыйных і прафсаюзных устаноў было яшчэ пастаўлена Сэсіяй ЦВК БССР у лютым 1921 году.

Беларускае сялянства, якое ў пераважнай большасьці зьяўляецца няпісьменным, ня прымала блізкага ўдзелу ў працы нашага савецкага апарату, бо ня ведала мовы гэтага апарату. Пытаньне аб прыцягненьні тысяч і сотняў тысяч сялян да ўдзелу ў савецкім будаўніцтве было шчыльна зьвязана з пытаньнем мовы. Апарат, які складаўся з старых расейскіх чыноўнікаў, альбо беларусаў, прайшоўшых старую расейскую русіфікатарскую школу, ня мог гаварыць з беларускім насельніцтвам на яго роднай, наогул зразумелай яму мове. Такім чынам пытаньне аб беларусізацыі шчыльна зьвязана з выкананьнем Ленінскага лёзунгу, што сацыялізм будзе будавацца рукамі не аднаго мільёну камуністаў, а рукамі мільёнаў рабочых і сялян, якія абавязкова павінны быць уцягнуты ў гэтую справу.

На гэты бок працы была зьвернута належная ўвага. Мы зараз маем ужо значныя посьпехі. 80 проц. працаўнікоў цэнтральных устаноў і 70 пр. акруговых і раённых устаноў уладаюць беларускай мовай. Шляхам цэлага шэрагу захадаў (за нежаданьне вывучаць беларускую мову было звольнена 27 чалавек) удалося пераламаць варожы настрой да беларусізацыі, да вывучэньня «хамскае» мовы, і ўрэшце наш апарат зьбеларусізаваўся. Фармальнымі іспытаньнямі, якія былі наладжаны ў шмат якіх установах, удалося ўстанавіць, што лёд крануўся. Першыя дасягненьні ёсьць. Створаны ўмовы, што зайшоўшаму ва ўстанову селяніну пабеларуску адказваюць, а ў некаторых нават пабеларуску і запытваюць. Гэта ў параўнаньні нават з 1924-25 годам буйныя дасягненьні, якія дазваляюць сказаць, што мы са справай беларусізацыі ўстаноў пасьпяхова спраўляемся.

Але ці могуць нас гэтыя дасягненьні цалкам задаволіць? Ці можам мы на падставе гэтага зьліквідаваць нашыя акруговыя нацкамісіі і зьняць з бюджэту спэцыяльна вызначаных для гэтае мэты асоб (па аднаму на акругу)?

Не. Яшчэ ня створаны ўсе абставіны для таго, каб справу беларусізацыі ў вузкім сэнсе гэтага слова (мова) была адсунута на другі плян. Чаму? Таму, што шмат хто яшчэ і зараз у нашым апараце разглядае ўсю справу беларусізацыі, як «палітыку», як нешта часовае, што праз нейкі час адпадзе. Фармальна падпарадкаваўшыся нашым пастановам, павярхоўна вывучыўшы мову, нашыя чыноўнікі ня хочуць ведаць гэтае мовы, ня хочуць удасканаліць свае веды так, каб яго сапраўды зразумеў беларускі селянін. Мы можам прывесьці сотні выпадкаў, калі беларускі селянін не разумее нашага чыноўніка, які гаворыць з ім пабеларуску, бо той увесь час, паглядаючы ў слоўнік, так і перакладае „ахмістрыня сельскае гаспадаркі“ (экономка сельского хозяйства), «шлюбнае шкло» (бракованное стекло), «мастацкі перапынак цяжарнасьці» (аборт) і г. д. Гэтых фактаў можна было-б налічыць у сотні разоў больш. Ня можна задаволіцца паказнай працай, вынікамі на паперы.

Праўда, пастаноў па гэтаму пытаньню ў нас занадта шмат. У пастановах недахвату няма. Зараз справа ў іх выкананьні, у іх ажыцьцяўленьні, а тут у нас часам яшчэ ня ўсё ў парадку.

Возьмем хоць-бы пастанову аб тым, што ўсе, хто можа гаварыць пабеларуску, павінен абавязкова ў сваіх выступленьнях карыстацца гэтай мовай. А як на практыцы? Далёка ня так. Шмат хто і забыўся пра гэтую пастанову. Больш таго, мы мелі выпадкі, што прадстаўнікі нашых цэнтральных устаноў, якія даўно павінны былі беларусізавацца, выступаюць на вялікіх адчыненых сходах па расейскай мове. Мо' гэта для таго, каб паказаць, што яшчэ расейскую мову не забылі? Хутчэй, думаецца, таму, што яшчэ беларускую мову ня вывучылі. Ня трэба-ж шмат доказаў, што ў зьвязку з гэтым некаторыя, што ў сябе ў хаце гавораць пабеларуску, прыходзячы ва ўстанову прымушаны гаварыць парасейску, каб, як кажуць, «не ударить лицом в грязь», альбо каб ня вызначыцца сярод сваіх таварышоў і супрацоўнікаў.

Ня лепш абстаіць справа з ужываньнем беларускае мовы сярод працаўнікоў ва **ўстановах**. Праўда, можна **адзначыць**, што паступова зжываюцца адносіны да беларускае мовы, як да мовы толькі ўстановы. Часам можна чуць, што беларуская мова ўжываецца ў прыватных гутарках ва ўстановах, галоўным чынам, сярод моладзі грамадзкіх, партыйных, камсамольскіх і савецкіх працаўнікоў, у некаторых выпадках нават небеларускай нацыянальнасьці. Але гэта яшчэ не агульнае зьявішча, гэта яшчэ толькі выпадкі, якія не дазваляюць нам рабіць вывад, што беларуская мова ўвайшла ў быт устаноў, нават тых, што ўжо беларусізаваны на 100 проц.

Наогул, гэтыя проценты вельмі туманная рэч. Пішацца ў справаздачы: «канцалярыя беларусізавана на 100 працэнтаў», а чытаецца: «сядзіць перакладчык і перакладае паперкі на беларускую мову».

Гэта мусіць таксама шматлікімі прыкладамі дэманстраваць ня трэба. Возьмем хоць-бы гэты:

> **Заг. Пэдкурсаў. Слуцак.**
>
> **Гарсавет на падставе ня маючых ніякіх ведаў аб ходзе працы Вашае ўстановы і ня атрымоўваючы пратаколаў пасяджэньня пэдрады, што не дае ніякага малюнку аб усебаковых становішчы пэдкурсаў, што і зьяўляецца зусім ненармальным.**
>
> **Інспэктар Нарасьветы.**

Вы што небудзь зразумелі? А гэткіх паперак мусіць па Слуцку шмат ходзіць. Хіба не народная асьвета ў нас у першую чаргу беларусізавана? Хіба ня інспэктар народнай асьветы падцягвае іншыя ўстановы, што не пасьпелі альбо ўхіляюцца ад беларусізацыі?

Ці возьмем гэткі прыклад. Адзін цэнтральны камісарыят у Менску піша ў рэдакцыі ўсіх менскіх газэт паступнае:

> **Пасылаючы свой плян працы, лічым неабходным каб н/плян быў улічан у працы газэт у сэнсе сьвядомасьці аб правадзімых работах і дзеля своечасовага асьвятленьня іх у друку, а таксама падрыхтоўкі матар'ялу па пытаньнях, маючых грамадзкую значнасьць, праз рабвяскораў і асьвятленьня ў друку з тым, каб матар'ял і прапановы рабвяскораў былі скарыстованы намі ў час абсьледваньня. Лічым неабходным, каб рэдакцыі газэт даручалі асобным работнікам сачыць за праходжэньнем нашых пытаньняў у напрамку асьвятленьня іх у друку з нашай Арггрупай і своечасовага прыцягненьня грамадзкага зданьня да гэтых пытаньняў, выходзячых з рашэньняў XV зьезду ВКП(б) XI зьезду КП(б)Б.**
>
> **Сэкратар (подпіс).**

Зразумелі? А гэты камісарыят лічыцца ў нас беларусізаваным на 100 проц. А гэтых прыкладаў можна было даць у шмат разоў больш. Хіба не гаворыць гэта аб тым, што ня ўсё чытаецца, як пішацца, што ня кожнай інфармацыі аб беларусізацыі можна верыць?

Стары чыноўнік акапаўся ў нашых установах, ён прыціх, палохаецца звальненьня на экзаменах ён на 100 пр. задаволіць ужо ня надта вялікія запатрабаваньні нашых камісій, а пасьля паціху, пасыўна, сыстэмай італьянскай забастоўкі, перашкаджае ажыцьцяўленьню беларусізацыі. Мы тут абсалютна не закранаем пытаньня аб расейскім шавінізьме, антысэмітызьме да беларусаў, яўрэяў, палякаў і г. д., а таксама мясцовым беларускім шавінізьме. Мы толькі тут падкрэсьліваем, што яшчэ не надышоў момант лічыць, што трэба ўсю ўвагу ў справе беларусізацыі перанесьці толькі на культурны фронт, абсалютна адмаўляючыся ад далейшай сапраўды поўнай беларусізацыі адміністрацыйнага апарату.

Тав. Кнорын на XI зьезьдзе КП(б)Б сказаў:

> **«Партыйныя кадры, як гэта было ўжо ня раз зазначана ў пастановах нашых партыйных зьездаў і пленумаў павінны тут паказаць прыклад. Бліжэйшы год павінен даць поўны пераход на беларускую мову.**
>
> **Некаторыя таварышы мне заяўлялі, што за апошнія месяцы ня было патрэбнае праверкі ходу беларусізацыі, з якой прычыны тэмп беларусізацыі аслабеў. Наконт праверкі—верна. Нам прышлося ўсю ўвагу сканцэнтраваць на барацьбе з унутрыпартыйнай апазіцыяй, на цэлы шэраг іншых пытаньняў, таму на некаторыя зьявішчы нашага жыцьця ў працягу апошніх месяцаў мы сапраўды рэагавалі са спазьненьнем.**
>
> **Якія нашыя задачы ў гэтай галіне? 1) Поўнае аўладаньне беларускаю мовою кіруючымі кадрамі партыі. 2) Караць сурова ўсіх, хто ўхіляецца, хто не разумее важнасьці гэтае справы. 3) Укараненьне беларускае мовы ў рабочае жыцьцё і быт, караць сурова тых, хто не разумее, што гэтым у нашых умовах вырашаецца пытаньне аб узмацненьні саюзу рабочае клясы з сялянствам“.**

Гэтыя задачы застаюцца, на іх ажыцьцяўленьне павінна быць зьвернута ўвага ўсіх нашых арганізацый. Праверка ажыцьцяўленьня беларусізацыі павінна быць больш глыбокая. Мы павінны ад апарату вымагаць больш, чым ён нам даваў дагэтуль, каб ён сапраўды абслугоўваў беларускае насельніцтва ў цэнтры і на мясцох на яго роднай мове.

Н. Ш.

(Працяг будзе).

Пра беларусізацыю.

ПАСТАНОВА

ПРЭЗЫДЫУМУ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР

аб практычных мерапрыемствах па выкананьні пастановы Прэзыдыуму Савету Нацыянальнасьцяй ЦВК Саюзу ССР па дакладу Ураду БССР аб беларусізацыі.

Паводле пастановы Прэзыдыуму Савету Нацыянальнасьцяй Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР ад 7-га кастрычніка 1927 году па дакладу Ураду Беларускае ССР аб правядзеньні беларусізацыі, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР **ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы:

а) Пашырыць выданьне масавай літаратуры і падручнікаў як на беларускай мове, гэтак і на мове іншых нацыянальнасьцяй, прыняць меры да зьніжэньня існуючых цэн на масавую літаратуру, [в]скарыстоўваючы для гэтай мэты спэцыяльна адпускаемыя сродкі з рэспубліканскага бюджэту, а таксама тыя сродкі, якія будуць адпушчаны з агульна-саюзнага бюджэту.

б) Узмацніць работу па ліквідацыі непісьменнасьці сярод дарослага насяленьня, з якой мэтай пашырыць сетку пунктаў на ліквідацыі непісьменнасьці, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на пашырэньне ініцыятывы ў гэтым напрамку т-ва «Прэч Непісьменнасьць».

в) Сумесна з Інбелкультам паглыбіць работу па вывучэньні розных галін жыцьця Беларусі, а таксама павялічыць работу па беларусазнаўству сярод працоўнага насельніцтва.

г) Устанавіць кантроль за тым, каб канчатковая беларусізацыя вышэйшых навучальных устаноў і прафшкол была скончана ў тэрміны, вызначаныя ў пастанове ЦВК БССР „Аб практычных мерапрыемствах па правядзеньні нацпалітыкі", прынятай на 2-й Сэсіі ЦВК БССР VI скліканьня (Збор З. і З. за 1924 г., № 11, арт. 108) і пастанове ЦВК і СНК БССР ад 17-га лістапада 1927 г. «Аб парадку беларусізацыі ўстаноў і арганізацый Гомельскай акругі» (Збор З. і З. за 1927 г. №46, арт. 245).

д) Арганізаваць плянавую падрыхтоўку навуковых працаўнікоў беларусоў як у вышэйшых навучальных установах БССР, гэтак і ў адпаведных навуковых установах іншых саюзных рэспублік, а таксама прыняць меры для прыцягненьня да працы ў вышэйшых навучальных установах БССР тых лепшых навуковых працаўнікоў-беларусоў, якія працуюць у іншых саюзных рэспубліках.

е) Пры прызначэньні навуковых працаўнікоў, а таксама пры высоўваньні іх на больш адказныя пасады, перавагу аддаваць тым асобам, якія пры наяўнасьці ідэалёгічнай блізасьці да рабочае клясы і належнай падрыхтаванасьці ведаюць беларускую мову і выяўляюць сябе на грамадзкай працы.

2. Даручыць Інстытуту Беларускае Культуры паскорыць падрыхтоўку беларускай навуковай тэрміналёгіі і распрацаваць праэкт спрашчэньня правапісу беларускае мовы.

3. Даручыць Нацкамісіі ЦВК у тэрміновым парадку распрацаваць і ўнесьці на зацьверджаньне Прэзыдыуму ЦВК парадак і тэрмін правядзеньня беларусізацыі ўстаноў транспарту, а таксама цэнтралізаваных гаспадарчых устаноў.

4. Даручыць Народнаму Камісарыяту Юстыцыі і гаспадарчым арганам БССР узмацніць работу па вылучэньні ў судовыя і гаспадарчыя органы на кіраўнічую работу рабочых і сялян-беларусоў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

2 лютага 1928 г.
г. Менск.

Постановление

ПРЕЗИДИУМА ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР

о практических мероприятиях по выполнению постановления Президиума Совета Национальностей ЦИК Союза ССР по докладу Правительства БССР о белоруссизации.

На основании постановления Президиума Совета Национальностей Центрального Исполнительного Комитета Союза ССР от 7 октября 1927 года по докладу Правительства Белорусской ССР о проведении белоруссизации, Президиум Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР **ПОСТАНОВЛЯЕТ:**

1. Поручить Народному Комиссариату Просвещения:

а) Расширить издание массовой литературы и пособий как на белорусском языке, так и на языках других национальностей; принять меры к снижению существующих цен на массовую литературу, использовывая для этой цели специально отпускаемые средства из республиканского бюджета, а также те средства, которые будут отпущены из обще-союзного бюджета.

б) Усилить работу по ликвидации неграмотности среди взрослого населения, с каковой целью расширить сеть пунктов по ликвидации неграмотности, обратив особенное внимание на увеличение инициативы в этом направлении О-ва «Долой Неграмотность».

в) Совместно с Инбелкультом углубить работу по изучению разных отраслей жизни Белоруссии, а также увеличить работу по белоруссоведению среди трудового населения.

г) Установить контроль за тем, чтобы окончательная белоруссизация высших учебных заведений и профшкол была окончена в сроки, установленные в постановлении ЦИК БССР «О практических мероприятиях по проведению нацполитики», принятом на 2-й Сессии ЦИК БССР VI созыва (Собр. З. и Р. за 1924 г., № 11, стр. 108) и в постановлении ЦИК и СНК БССР от 17 ноября 1927 г. «О порядке белоруссизации учреждений и организаций Гомельскага округа» (Собр. З. и Р. за 1927 г. № 46, стр. 245).

д) Организовать плановую подготовку научных работников белоруссов как в высших учебных заведениях БССР, так и в соответствующих учебных заведениях других союзных республик, а также принять меры к привлечению к работе в высших учебных заведениях БССР лучших научных работников-белоруссов, работающих в других союзных республиках.

е) При назначении научных работников, а также при выдвижении их на более ответственные посты, преимущество отдавать тем лицам, которые при наличии идеологической близости к рабочему классу и соответствующей подготовки, знают белорусский язык и проявляют себя на общественной работе.

2. Поручить Институту Белорусской Культуры ускорить подготовку белорусской научной терминологии и разработать проект упрощения правописания белорусского языка.

3. Поручить Нацкомиссии ЦИК в срочном порядке разработать и внести на утверждение Президиума ЦИК порядок и сроки проведения белоруссизации учреждений транспорта, а также централизованных хозяйственных учреждений.

4. Поручить Народному Комиссариату Юстиции и хозяйственным органам БССР усилить работу по выдвижении в судебные и хозяйственные органы на руководящую работу рабочих и крестьян-белоруссов.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Червяков.**

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Хацкевич.**

2 февраля 1928 г.
Г. Минск.

Перад 10-ай гадавінай Чырвонай арміі.

Рыхтуемся да вялікага сьвята.

Камсамол і ТДА-Авіяхім праводзяць баявы агляд сваіх шэрагаў.

(Ліст з Воршы).

Да сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Чырвонай арміі ў Аршанскай акрузе вядзецца ўзмоцненая падрыхтоўка.

Арганізаваны дзьве юбілейныя камісіі: адна пры акругкоме КП(б)Б, другая—гарадзкая гарнізонная камісія.

Шырока разгорнута кампанія па падрыхтоўцы к сьвяткаваньню на мясцох сярод вясковага і местачковага насельніцтва. Пры райвыканкомах, раёнτων установах і прадпрыёмствах, пры сельсаветах арганізуюцца таксама юбілейныя камісіі па правядзеньню сьвята.

Па ўзгодненаму пляну акруговай і гарнізоннай камісіямі будзе праароблена як у горадзе, таксама і ў вёсцы, наступнае: будуць праводзіцца гутаркі, наладжвацца вечары ўспамінаў, даклады аб заснаваньні Чырвонай арміі, будуць шырока высьветлены задачы і мэты абароны краіны і ўдзелу ў ёй насельніцтва і г. д.

Сярод вясковага насельніцтва па ўсіх клюбах, хатах-чытальнях, чырвоных кутках будуць арганізаваны выстаўкі вайсковай літаратуры і дыяграм.

ТДА-Авіяхім праводзіць агляд сваіх шэрагаў і працы праз арганізацыю стралковых спаборніцтваў. Шырока будзе разгорнута вярбоўка ў шэрагі ТДА-Авіяхіму.

Камсамол арганізуе агляд баявой гатоўнасьці камсамольскіх арганізацый.

Сем'і чырвонаармейцаў, якія патрабуюць дзяржаўнай дапамогі, будуць па магчымасьці забясьпечаны. Таксама дэмабілізаваныя чырвонаармейцы і камсклад будуць забясьпечвацца працай.

С.

Удзел „Чырвонага Крыжу" ў сьвяткаваньні

У правядзеньні сьвята 10-й гадавіны Чырвонай арміі ўсе арганізацыі і сябры беларускага т-ва Чырвонага Крыжу прымуць актыўны ўдзел. Гэта сьвята будзе праводзіцца т-вам пад лёзунгам узмацненьня санітарнай абароназдольнасьці краіны, санітарнай ваенізацыі сяброў т-ва, і папулярызацыі задач Чырвонага Крыжу сярод чырвонаармейцаў і шырокіх колаў працоўнага насельніцтва. Дзеля гэтага будуць праведзены агульныя сходы сяброў т-ва, дзе будуць пастаўлены даклады аб ролі Чырвонага Крыжу ў час вайны і аб яго задачах у справе ўзмацненьня санітарнай абароназдольнасьці краіны. Гэтыя-ж даклады будуць пастаўлены на сходах чырвонаармейцаў, рабочых, сялян і служачых.

Беларускае т-ва Чырвонага Крыжу мяркуе таксама наладзіць агляд гурткоў першай дапамогі праз часопісь «Работніца і Сялянка», бюлетэнь ЦК. Лепшым гурткам і і лепшым карэспандэнтам будуць выдадзены прэміі.

У дні сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Чырвонай арміі адбудуцца ўрачыстыя выпускі, скончыўшых гурткі першай дапамогі. Гэтыя выпускі будуць праводзіцца сумесна з прадстаўнікамі Чырвонай арміі і іншых арганізацый.

Да сьвята таксама будзе прыстасавана арганізацыя новых санітарных дружын Чырвонага Крыжу, новых ячэек, гурткоў першай дапамогі і куткоў санітарнай асьветы.

Для азнаямленьня з бытам чырвонаармейцаў і ўстанаўленьня з апошнімі цеснай сувязі, у парадку сьвяткаваньня будуць пасылацца дэлегацыі гурткоў і дружын першай дапамогі ў вайсковыя часьці і казармы.

Апрач гэтага, для гурткоў і дружын Чырвонага Крыжу будуць арганізаваны супольна з часьцямі Чырвонай арміі і ТДА—Авіяхіму выхады ў поле на практычныя заняткі, манэўры, інсцэніроўкі і г. д. Гурткі першай дапамогі і санітарныя дружыны прымуць таксама ўдзел у дэманстрацыях і парадах.

Сьвяткаваньне 10-цігодзьдзя Чырвонай арміі супадае з перавыбарчай кампаніяй нізавых органаў Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу. Вось чаму гэтыя кампаніі павінны будуць увязаны ў мэтах большага ўцягненьня працоўных у шэрагі т-ва.

М. А—скі.

Чырвоная армія—школа сялянскай моладзі

(№ стралк. полк. гор. Чэрвень).

Усяго тры месяцы прайшло з таго часу, як Габрусь зьмяніў шэрую вопратку, стаптаныя лапці на новую шынэль, боты ды шлем з пяцікантовай зьвяздой, а няпрыемнасьцяй перажыў занадта шмат.

Ды і як тут іначай магло быць?

Хай толькі прыдзе з дому ліст—няма горшага ліха Габрусю. Насіцца ён з ім, што кот з салам, ды рады мала. Да аднаго падыйдзе:

— Таварыш, мо пачытаеце мне ліст?

— Няма, таварыш, часу чытаць твае лісты, а падругое, трэба самому ўмець; у Чырвонай арміі няпісьменных быць не павінна.

Да другога, трэцяга,—усюды адны адказы, усе ў адну дудку граюць. І пакуль не навалтузяць беднага, датуль ніхто і ня возьмецца за ліст.

А калі і возьмецца хто, дык перш назаніць, а пасьля ўсе пасьмяюцца і толькі тады пачынаецца чытацца праўда.

Ды гэта-ж толькі прачытаць ліст; яшчэ горш бывае тады, калі Габрусь задумае адпісаць ліст дамоў. Тут кожны паспавядае: «А чаму ня вучыўся, чаму на лікпункт не хадзіў». Усякую ўсячыну прыпомняць.

— Ну, хлопцы, даволі прыставаць—сам ведаю, што дрэнна. Запісаўся ў гурток няпісьменных і хутка буду сам пісаць, а пакуль што напішэце,—адгаворыцца бывала Габрусь.

Як дрэнна жылося Габрусю першы месяц—сказаць немагчыма, але патрохі справа зьмянялася к лепшаму.

Ужо на другі месяц жыцьця ў арміі Габрусь здолеў зьвязаць літару з літарай і прасьлібізаваць на старонках лемантара:—„Чырво... во-о-на-я армія—школа сялянскае... кай мол.. ладзі".

Ну, а цяпер Габрусь зусім стаў вольным чалавекам: ён ужо нікога ня просіць: «напішэце, таварыш, прачытайце».

Ён ужо трэці канвэрт сваёй уласнай рукой адмалява́ў, хоць літары і распаўзаюцца, як па драбіне: адна ўверх, другая ўніз, але імі Габрусь больш цешыцца, як тымі пекнымі, што пісалі таварышы.

У ленінскім кутку па вечарох Габрусь ужо не сядзіць ціханька, слухаючы, як таварышы чытаюць, не сайдросьціць і тым, хто піша ліст дамоў, бо ён ужо сам майстра на гэта.

Не дарма-ж наведваў гурток няпісьменнасьці праз увесь час.

Хто-небудзь гатоў падумаць, што Габрусь ужо больш і ня думае вучыцца, дык не. Прыдзіце на заняткі агульна-адукацыйнага гуртка і там вы ўбачыце Габруся: ён або складае лічбы, або разьвязвае задачы, або піша што-небудзь.

І цяпер, калі ў яго запытаецца хто:—„Як твае справы"? Габрусь з радасьцю адкажа:

— Самае галоўнае зрабіў: навучыўся пісаць трохі і чытаць, цяпер усюды і заўсёды буду мець менш бяды.

А на апошніх палітычных занятках паліткіраўнік прама сказаў:

— Тав. Кувіцкі, як відаць, хутка ўсіх пераганіць і ў справе вайсковай і ў палітычнай.

Відома, не цягнуцца-ж яму ў хвасьце сваіх таварышоў, калі ён ужо стаў пісьменным хлопцам.

П. Ліхтаровіч.

Аб рэпэртуары да 10-цігодзьдзя.

У зьвязку з надыходам 10-цігодзьдзя Чырвонай арміі, пытаньне аб рэпэртуары ў адзнаку юбілею для нашых клюбаў, нардамоў і хат-чытальняў зьяўляецца надзвычайна важным. Бязумоўна, што той рэпэртуар, які да гэтага часу ставіўся нашымі клюбамі і хатамі-чытальнямі, мала здавальняў гледача. Трэба было хутка стварыць такі рэпэртуар, які адбіваўся-бы гераічную барацьбу Чырвонай арміі і ў той жа самы час зьяўляў-б мастацкім паказам, захапляў бы нашага гледача. На вялікі жаль, мы на сваёй беларускай мове к 10-цігодзьдзю ня маем такога рэпэртуару, але затое на расейскай мове такі рэпэртуар маецца. П'есы: «Мятеж» Фурманава і Паліванава і «Разлом» Лаурынёва пасьля апошняй перапрацоўкі і зьмен, лёгка могуць быць скарастаны на нашых клюбных сцэнах (аб каштоўнасьці іх казаць ня прыходзіцца, п'есы якія з вялікім посьпехам ішлі ў Маскве і Ленінградзе).

Апрача іх вышла з друку і паступіла ў продажу п'еса Жарава і Рэгеніна «Кто там идет» у 3-х дзеях, з песьнямі, жартамі і гульнямі. Твор напісан у стылю «Гротэско».

У вясковых хатах-чытальнях і нардамох магчыма скарыстаць спэц. зборнік „К юбилею Красной армии", дзе зьмешчана 7 невялічкіх твораў, на рознастайныя тэмы, пры чым у адзін вечар можна ставіць па некалькі нумароў. Напрыклад, «Десять лет Красной армии» і „Веселый подвох"—водэвіль з песьнямі і гульнямі на тэму аб задачах адпускніка ў вёсцы і г. д.

Такім чынам, к 10-цігодзьдзю Чырвонай арміі ў нас ёсьць добры рэпэртуар, які магчыма скарыстаць як на клюбнай, таксама і на вясковай сцэне, трэба толькі зараз жа пачаць падрыхтоўку.

І. Хоцька.

Наш полк дапамагае беднаце.

(№ тэрполк, г. Чэрвень).

Вайсковыя служачыя палка зьяўляюцца шэфам над Грэбянецкім с.-саветам. Побач з культурным абслугоўваньнем наш полк даў камітэту сялянскае ўзаемадапамогі вялікую, аплачвае хату, памятую для правядзеньня працы сярод жанчын-дэлегатак і ў гэтыя месяцы выяжджае палкавы-доктар для аказаньня дапамогі насельніцтву.

Для ўзмацненьня фонду Чэрвеньскага камітэту ўзаемадапамогі полк паставіў адзін кіно-сэанс, ад якога выручана і здадзена 89 руб.

Працоўнае насельніцтва вельмі даражыць і паважае працу, якая праводзіцца палком (вайсковую, палітычную, культурную) у раёнах свайго камплектаваньня і дапамагае ў яе правядзеньні.

Я.

ПРЫВІТАНЬНЕ СТАРШЫНІ ЦВК УКРАІНЫ ТАВ. ПЯТРОЎСКАМУ.

ДАРАГІ РЫГОР ІВАНАВІЧ!

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае Са цыялістычнае Савецкае Рэспублікі шчыра вітае Вас з Вашым пяцідзесяц годзьдзем.

Яшчэ ў юнацкія гады Вы пачалі прыймаць актыўны ўдзел у барацьбе за справу рабочае клясы і, такім чынам, Ваша жыцьцё можа служыць прыкладам аддана сьці пралетарскай рэвалюцыі і барацьбы за камунізм.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР выказвае пажаданьне, каб Вашы сілы, вопыт, энэргія і загартаванасьць яшчэ доўгі час служылі на карысьць працоўных.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

Маленькі фэльетон.

ХУТКАЯ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ.

— Не, так нельга падыходзіць,—захваляваўся старшыня трэсту,—я разумею, што трэба скарачаць выдаткі, але нельга-ж ламаць апарат. Я зусім ня згодзен з таварышом з РСІ.

Таварыш з РСІ спакойна запрапанаваў:

— Давайце разам паглядзімо, дзе ў вас можна сьціснуцца, тагды і будзем гутарыць пра ломку апарату.

— Давайце, — паціснуў плячыма старшыня.

Намесьнік старшыні ўзяў сьпіс і пачаў чытаць:

— У фінаддзеле штат 114 чалавек: загадчык, 6 галоўных бухгальтараў, 15 памоцнікаў галоўных бухгальтараў. 38 загадчыкаў часткамі і аддзяленьнямі, 24 сэкратары, 16 дзелаводаў, 11 рахункаводаў, скарбнік і 2 кур'еры. Скараціць нічога нельга.

Таварыш з РСІ ўважліва глянуў на намесьніка старшыні:

— Ніяк нельга? А калі аб'яднаць некаторыя часткі і аддзяленьні, дык ці загадчыкаў зьменшыцца?

Намесьнік старшыні кіўнуў галавою.

— Значыць,—ня суніма́ўся таварыш з РСІ,—трэба пераглядзець працу фінаддзелу і рацыяналізаваць яе.

З месца ўскочыў загадчык фінансавым аддзелам:

— Вы гаворыце аб працы фінаддзелу, ня ведаючы яе. Я пратэстую. Я лічу, што пры сучасных нашых зваротах ні пра якое скарачэньне штатаў у маім аддзеле і гутаркі быць ня можа. Апроч таго, утрыманьне штату фінаддзелу абыходзіцца нам досыць такі танна, глупства, некалькі тысяч рублёў у месяц. Я прапаную перайсьці да іншых аддзелаў.

Старшыня кіўнуў галавою. Намесьнік старшыні прачытаў далей:

— Арганізацыйны аддзел. Штат 82 чал.: 26 інструктароў па 2 на акругу, фінансавая частка 12 чал., скарбнік, рахунковая частка і кур'ер.

— Проста не хапае,—разьвёў рукамі загадчык арганізацыйным аддзелам,—я і так хацеў прасіць аб павялічэньні штатаў у зьвязку...

— Як вам ня сорам,—перапыніў яго старшыня,—дадзена дырэктыва аб скарачэньні, а вы думаеце аб павялічэньні. Трэба выконваць дырэктывы, а вы—раздуваць штат. Будзьце задаволены, што вам пакідаюць ваш ранейшы штат. Таварыш намесьнік, чытайце далей.

— Загатоўчы аддзел, —чытаў далей намесьнік старшыні, —зьяўляецца нашым асноўным аддзелам; ён налічвае 242 чал., у тым ліку фінансавая частка, рахункаводы, скарбчыкі, агенты для даручэньняў і 2 кур'еры. Я думаю...

— Скараціць загатоўчы аддзел,—заявіў намесьнік загадчыка загатоўчага аддзелу,—значыць сарваць нашы загатоўкі сыравіны. А сарваць загатоўкі, значыць сарваць плян працы прамысловасьці і ў выніку сарваць індустрыялізацыю краіны. Я спадзяюся, што РСІ ня мае на мэце зрыву індустрыялізацыі,—з прыемнаю ўхмылкаю пажартаваў намесьнік загадчыка.

Таварыш з РСІ паляпаў пальцам па партфэлю і сур'ёзна зазначыў:

— Мы ня зрываем, а вось нехта другі зрывае. Інакш кажучы,—раззлаваўся таварыш з РСІ,—будзеце скарачаць ці не?

Старшыня зрабіў суровы выгляд:

— Дырэктыву ўраду выканаем. Канкрэтна прапаную: скараціць ва ўсіх аддзелах 50 проц. кур'ераў. Мы гатовы на ахвяры. На з'эканомленыя 115 рублёў у месяц пабудуем лішні завод. Хто проці? Аднагалосна.

Таварыш з РСІ ўстаў, узяў партфэль і заявіў:

— Дык вось, я выслухаў ваш погляд. На чарговым пасяджэньні калегіі РСІ будзе абмяркована пытаньне аб злучэньні вашых аддзелаў і пад'аддзелаў, у выніку чаго давядзецца скараціць ня толькі кур'ераў, але галоўным чынам, ня менш паловы прысутных тут на пасяджэньні адказных працаўнікоў. Бывайце здаровы.

— Таварыш з РСІ, таварыш... ды мы... ды дырэктыва... Ня слухае... Пайшоў...

На другі дзень была паслана паперка за подпісам старшыні, у якой паведамлялася ў РСІ, што дзякуючы праведзенай за ўчарайшы дзень рацыяналізацыі ўстановы, удасца скараціць 30 пр. штату і 31,78 пр. выдаткаў. У паперцы зазначалася, што памянёная рацыяналізацыя была праведзена па ініцыятыве і пры самым актыўным удзеле ўсіх адказных працаўнікоў установы, прасякнутых шчырым жаданьнем дапамагчы справе індустрыялізацыі краіны.

П. Б.

Вечар пісьменьніка і чытача.

6 лютага ў памяшканьні Дому Асьветы аб'яднаньнем паэтаў і пісьменьнікаў «Полымя» быў наладжан вялікі дыспут на тэму: Пісьменьнік і чытач.

Перапоўненая заля з зацікаўленасьцю слухала даклад-уступнае слова Цішкі Гартнага.

Пытаньне аб вывучэньні чытача да гэтага часу ў нас ня вывучана,—каже Цішка Гартны.

Першую спробу ў нас на Беларусі мы робім сёньня. Да гэтага часу рэдакцыя часопісі «Полымя» прымала захады вывучыць чытабельнасьць беларускіх кніжок па бібліятэках. А сёньня самае галоўнае,—каб выказаўся чытач. Што ён чытае з беларускай літаратуры, што любіць, чаго патрабуе ад пісьменьніка.

Толькі цяпер, калі беларуская культура шпаркім тэмпам захапляе шырокія масы, мы ставім пытаньне аб вывучэньні чытача. У нашаніўскі перыяд чытач быў ня сталы, не аформлены, часамі выпадковы. Цяпер мы маем нешта акрэсьленае, але ня вывучанае.

У нас, на мой погляд, асноўная маса чытача складаецца, паперш ае, з настаўніцтва, затым ідуць беларускія культурныя працаўнікі, навуковыя, газэтныя. Студэнцтва і вучнёўства таксама чытае нашу кніжку.

Якую-ж кніжку чытае наш чытач? Ён патрабуе з бібліятэкі тоўстую кніжку—каб было што чытаць. Бязумоўна, настраёвасьць зьместу адыгрывае вялікую ролю ў чытабельнасьці кніжкі.

Бязумоўна, што падручнікі разыходзяцца ў большым ліку. Тыраж нашай мастацкай літаратуры—прыблізна 3000 экзэмпляраў і гэтыя 3000 экзэмпляраў разыходзяцца на працягу двухдвух з паловаю гадоў. Калі лічыць у процантных адносінах, тыраж нашых выданьняў ня меншы ў параўнаньні з расейскім і украінскім тыражамі.

Мы сёньня пытаньне ставім так, каб чытач прад'яўляў пісьменьніку, чаго ён ад яго патрабуе.

Тав. Сташэўскі, выступіўшы у спрэчках, падзяліў чытача на дзьве катэгорыі. Ёсьць дарослая частка, якая разумее розныя „пунсовыя сіні", але ёсьць і другая частка, якая ня ведае, у чым тут справа. Чытачу патрэбна цікавая тэма, простая форма. Мудрагельства выклікае толькі сьмех у чытача.

Тав. Шушкевіч адзначыў, што і да гэтага часу ў нас няўмела распаўсюджваецца кніжка. Да таго дарагая цана на яе адбівае чытача. Далей спыніўся Шушкевіч на крытыках «з доўгімі вушамі», якія пішуць надзвычайна няўдалыя рэцэнзіі на кніжку.

Чытач Цэхановіч гаварыў аб прыкметнай штучнасьці і ў некаторых выпадках агітацыйнасьці ў нашай літаратуры. Ён прасіў даць добраякасную, цікавую і танную кніжку.

Чытач А. Цьвікевіч заўважыў, што мы не выдаём перакладной літаратуры з чужаземных моў. Ён скардзіцца, што пісьменьнікі пад-час проста пякуць свае творы «з калена»—а таму адчуваецца схэматычнасьць. За просты, жыцьцёвы рэалізм, за бытавую і добра напісаную і апрацованую кніжку—заклікае Цьвікевіч. Ён заўважае, што не пашкодзіла-б і выдаваць творы прыключэнскага характару.

Выступіўшы т. Гарадзенскі заўважае, што асноўным чытачом беларускай літаратуры зьяўляецца рабоча-сялянская моладзь, у першую чаргу камсамол. Ён просіць даць жывога чалавека, бо чытача с х э м а й ня возьмеш. Нам п а т р э б н ы крыткі не ад слова «крыць» альбо хваліць, а такія, якія-б падрыхтоўвалі чытача да твору.

Міхась Зарэцкі паказваў, што ў нас ёсьць ухіл адрыву ад жыцьця, ад сучаснасьці ў нашай літаратуры. Ня пісьменьнік павінен зьніжацца да чытача, а ён павінен разам з сабою цягнуць яго. Нам патрэбны і тоўстыя кніжкі для бібліятэк і тонкія для дарожнага чытача.

Тав. **Цішча Гартны** ў сваім заключным слове адказаў на вялікі ліп запісак па пытаньнях беларускай літаратуры. Нам патрэбна стварыць, казаў ён, такія адносіны да кніжкі, такую пашану, якая-б сьведчыла аб нашым культурным узросьце, а пакуль што гэтага няма.

Спажывецкая каапэрацыя ў вёсцы.

Чаму Хацкевіч зноў хацеў быць каапэратарам.

Ня так даўно адбывалася абнаўленьне складу праўленьня Старасельскае каапэрацыі. Стары старшыня пайшоў «на адпачынак». Цяжка было разлучацца з каапэрацыяй гр-ну Хацкевічу.

Затрачана было шмат энэргіі і сіл т. Хацкевічам, каб папасьці зноў на гэту «любімую» пасаду, але справа ня клеілася. Ён ішоў на ўсе ўступкі; даваў пяць рублёў скідкі са сваёй пэнсіі, але нічога ня ўплывала на сялян. Ужываў усялякія хітрасьці, зьбіраў нікому невядомы сход упаўнаважаных—сяброў і стараўся правесьці сход у сваю карысьць, але зіркае вока старшыні сельсавету дапільнавала гэту справу. Што цягнула гр. Хацкевіча зноў на пасаду старшыні? За час яго працы ў каапэрацыі, як унутраны, так і знадворны выгляд яго гаспадаркі значна палепшыўся. Трэба думаць, што гр. Хацкевіч забясьпечваў надоўга лепшымі таварамі, каторыя трымалі роўны шлях на кватэру, а не ў каапэратыў. Калі-ж справу трэба было афарміць, дык ён саваў накладныя для подпісу прыказчыку гр. Пуйману, гаворачы:

— Ты падпішы, а тавар лічы за мной.

Такім чынам, спажывецкая каапэрацыя перажывала цяжкія моманты і з прыбытку пераходзіла на недабор.

Пажадана было-б, каб туды заглянула рэвізійная камісія і вынікі апошняй былі вядомы.

Старасельскі.

Заслаўскі р., Меншчына.

На 10-хрублёвы пай.

21 студзеня ў нашым сяле адбылося пасяджэньне актыву, на якім ставілася пытаньне аб павялічэньні паю да 10 руб.

Інструктар райсаюзу т. Чэрняк растлумачыў прычыны павялічэньня пая і ўсе хвалюючыя наш актыў пытаньні. Актыў вынес пастанову перайсьці на 10-хрублёвы пай, растлумачыўшы насельніцтву прычыны пераходу на 10-хрублёвы пай.

П-шчык.

В. Прысна, Гомельшчына.

Крама на замку.

У вёсцы Багданавічах ёсьць аддзяленьне каапэратыву, загадчыкам якога зьяўляецца селянін гэтай-жа вёскі, нехта Міхась Сарафімовіч. Каля каапэратыву заўсёды стаіць чарга сялян. Чарга тут зьбіраецца не таму, што шмат пакупцоў, а таму, што ніколі няма загадчыка ў каапэратыве. Сяляне пастаяць каля сьцен каапэратыву і разыходзяцца дамоў бяз нічога.

Цяпер сяляне, каб ня траціць марна часу, езьдзяць у мястэчка Карму за дзесяткі вёрст за таварамі, ня гледзячы на тое, што ў сваёй вёсцы ёсьць каапэратыў.

Адважны.

Карманскі раён, Магілеўшчына.

Няма давер'я—ня можа быць і працы...

Як паведамлялася ўжо ў друку, у Шацкай спажывецкай каапэрацыі ёсьць растраты на 2000 руб. Як бачыце, сума ня зусім маленькая і на яе трэба зьвярнуць увагу, таму, што гэтая растрата вельмі надарвала як гандаль нашае каапэрацыі, таксама і аўтарытэт яе ў вачох насельніцтва.

За мінулы год мы зьявяліся сьведкамі цэлага шэрагу дробных растратаў як у чайнай каапэрацыі, так і ў яе крамах № 2 і № 4, але з тэй прычыны, што праўленьнем каапэрацыі, а таксама і рэвізкамісіяй ня былі прыняты ў свой час належныя заходы да зьліквідаваньня гэтае ненармальнасьці: ня былі з сунуты ад працы растратчыкі,—справа каапэрацыі ня толькі не паляпшалася, але, наадварот, пагаршалася з кожным часам. Апрача таго, сярод членаў праўленьня каапэрацыі распачалася «грызьня», што таксама вельмі шкодна адбівалася на працы т-ва.

З прычыны нядадоў сярод членаў праўленьня, апошнія, можна сказаць, не зьвярталі належнае ўвагі на працу ў крамах т-ва, а ў выніку ня[дбай]ных адносін пачаўся недахват у крамах т-ва патрэбных насельніцтву тавараў. Наўкола каапэрацыі сталі распаўсюджвацца розныя чуткі, што ў самым корані надарвала аўтарытэт праўленьня, і калі распачалася кампанія на ўцягненьню насельніцтва ў шэрагі сяброў каапэрацыі, то яна дала вельмі нязначныя вынікі.

Крамныя камісіі пры крамах т-ва бязьдзейнічалі ўвесь час, бо праўленьне, занятае «грызьнёй», не зварочвала на іх працу ніякае ўвагі. Усе чакалі перавыбараў праўленьня, каб на справе даведацца аб сапраўдным становішчы т-ва.

Распачалася перадвыбарная справаздачная кампанія каапэрацыі, але насельніцтва нічога тут не даведалася, таму што за «непадрыхтаванасьцю» рэвкамісіі, справаздачы яе ня было і пайшчыкі на пунктах атрымлівалі ад праўленьня толькі сухія лічбы аб працы без пацьверджаньня іх рэвізійнай камісіяй. Вось чаму пайшчыкі па справаздачы праўленьня не маглі даць належнага наказу ў далейшай працы каапэрацыі—ні праўленьню, ні сваім упаўнаважаным, а таму і перавыбары праўленьня, можна сказаць, вышлі куртатыя... Апрача таго, у самы дзень перавыбараў праўленьня з некаторых вёсак упаўнаважаных ад пайшчыкаў на перавыбарах зусім ня было па прычыне вялікай завірухі ў гэты дзень, але перавыбары праўленьня ўсё-ж такі адбыліся.

У склад новага праўленьня ўвайшлі ўсе старыя члены праўленьня, за выключэньнем старшыні праўленьня с. Скорабагатага, на месца якога давыбралі новага сябра.

Паўстае цяпер пытаньне ў пайшчыкаў: калі ўжо адзін толькі старшыня праўленьня Скорабагаты вінаваты ў растраце 2000 р. у т-ве?.. На мой погляд вінаватымі тут трэба лічыць усё праўленьне былое і разам рэвізкамісію. Патрэбна зрабіць нанова перавыбары праўленьня і ўсіх старых с.с. праўленьня разам са старымі членамі рэвізкамісіі мятлою вымесьці з каапэрацыі і прыцягнуць іх усіх да адказнасьці, толькі тады падымецца аўтарытэт каапэрацыі ў вачох насельніцтва. Існуючаму-ж складу праўленьня каапэрацыі давер'я з боку насельніцтва няма і ня можа быць.

Пайшчык.

Хатлянскі сельсавет, Вузьдзенскага раёну, Меншчына.

„Прывязі белку—атрымаеш тавар".

У Зацекляскім с-с. у 10 гадавіну Кастрычніковай рэвалюцыі была адчынена крама Лепельскага спажывецкага таварыства. І да гэтага часу па с-с., які налічвае 307 гаспадарак каапэравана каля 58 гаспадароў, што складае 17 проц. Усё гэта добра, але справа кепска з тым, што Лепельскае т-ва калі адпускае тавар для Зацекляскай крамы, то добры тавар, як сукно, мультан і інш., адпускае на тэй пушніне якую загатовіць крама. Былі выпадкі, калі старшыня праўленьня Лепельскага т-ва Кавальчук казаў: «сукна не дано, бо ня прывёз пушніны і ў далейшы час будзем адпускаць на пушніну». Але каб хто запытаўся ў т. Кавальчука, чым крама вінавата, калі паляўнічыя не нясуць пушніну у краму, а ў саюз паляўнічых. Няўжо пайшчыкі вінаваты, што кожны паляўнічы згодна статуту саюзу паляўнічых нясе пушніну ў саюз. Няўжо Лепельскае т-ва «мае дырэктывы адпускаць тавар пад пушніну».

Пайшчык.

Лепельскі р., Полаччына

ПАЗЫКА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЯЛЯНСКАЕ ГАСПАДАРКІ

Сялянства ахвотна купляе пазыку

(Ліст з Бабруйску).

Асаблівую актыўнасьць у справе распаўсюджваньня пазыкі выяўляюць камсамольскія арганізацыі. Шэраг райёнаў абвясьцілі конкурсы на лепшага камсамольца-распаўсюджвацеля пазыкі.

Праца па растлумачаньні важнасьці пазыкі пастаўлена добра. Яна ахоплівае самыя глухія куткі Бабруйшчыны.

Весткі, якія ідуць з вёсак, гавораць аб тым, што падрыхтоўчая праца не прапала марна, што пазыка шырока распаўсюджваецца сярод бабруйскага сялянства. Застрэльшчыкамі—першымі пакупцамі пазыкі на вёсцы зьяўляецца бедната і вясковы актыў. На яго прыкладу ідзе і ўся вёска.

Некалькі прыкладаў з вёскі паказваюць, як ідзе справа распаўсюджваньня пазыкі.

Так, у першы-ж дзень, як толькі прыбылі аблігацыі пазыкі ў в. Кароткавічы (Жлобінскі раён), было прададзена іх на 140 рублёў.

Бедната Берасьнёўскага сельсавету заявіла, што выйгрышы, якія выпадуць на аблігацыі, павінны пайсьці ў фонд узмацненьня сельскай гаспадаркі.

Сяляне вёскі Васвічы і Бацэвічы, Клічаўскага раёну, адразу падпісаліся **на 577 рублёў**. Амаль кожны з іх падпісаўся на 20-25 руб. Сяляне вёскі Усохі, таго-ж сельсавету, з прычыны адсутнасьці сродкаў, пастанавілі: узяць на распрацоўку ў Лесбеле дзялянку лесу і на зароблены грошы закупіць аблігацыі пазыкі.

Некаторыя сяляне падпісваюцца калектыўна на пазыку. Так, усе сяляне пасёлку Дзеднае, Бабруйскага раёну, калектыўна падпісаліся на 50 рублёў.

Камсамольскія ячэйкі актыўна праводзяць працу па рэалізацыі пазыкі. Некаторыя з іх здолелі рэалізаваць ужо пазыкі на паўтысячы рублёў.

Прыкладаў такіх можна прывесьці безьліч. Усе яны сьведчаць аб тым, што бабруйская вёска раскачалася, што пазыка шпаркімі крокамі пойдзе ў сялянскія масы.

А. Дамброўскі.

Па БССР рэалізавана сялянскай пазыкі на 81375 руб.

Паводле даных на 1-га лютага па ўсёй БССР рэалізавана аблігацый пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на 81.375 руб. З гэтай сумы рэалізавана выключна ў сельскіх мясцовасьцях 69.619 руб. Першае месца па рэалізацыі пазыкі займаюць Мазырская, Менская і Бабруйская акруга. Пакуль што слаба стаіць справа з рэалізацыяй пазыкі ў Магілеўскай, Полацкай і Віцебскай акругах.

ВІЦЕБСК, 7-II (па тэлеграфу). Па вестках на 1-га лютага ў Віцебскай акрузе рэалізавана сялянскай пазыкі на 5.800 руб., з іх на 5.100 руб. у сельскіх мясцовасьцях.

Узяліся распаўсюдзіць на 50.000 руб.

(Па тэлефону ад ул. кар-та).

ВОРША, 7-II. На карадзе Горацкім прафактыве, дзе прысутнічала 40 чалавек актыўных прафэсыянальных працаўнікоў, разгледжана пытаньне аб рэарганізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі. Аднагалосна пастаноўлена распаўсюдзіць па саюзах аблігацыі пазыкі на 50.000 руб. Пастанова ажыцьцяўляецца.

Сводка

ПАСТУПЛЕНЬНЯ С.-Г. ПАДАТКУ ЗА ЧАС З ПАЧАТКУ КАМПАНІІ ДА 1-ГА ЛЮТАГА 1928 Г.

АКРУГІ.	ПАСТУПІЛА:				Проц. выпаўненьня гад. задан.
	Акл.	Нядоім.	Пені.	Усяго.	
Мазырская	540.122	3.626	4 503	548.251	90,9
Бабруйская	1.272.120	17.790	12.280	1.302.190	88,9
Полацкая	474.969	4 279	4.897	484.145	86,8
Віцебская	814 810	8.576	8.781	832.167	86,7
Магілеўская	1.202.233	17.289	12.608	1.232.130	85,1
Аршанская	818.492	13.071	9.620	841.183	85.0
Менская	1.337.008	22.376	23.165	1.382.549	81,7
Гомельская	830.093	14.318	11.738	856.149	80,9
Агулам па БССР	7.289.847	101.325	87.592	7.478.764	85,2

У САВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР.

(Пасяджэньне 1 лютага г. г.)

На гэтым пасяджэньні разам з іншымі былі разгледжаны наступныя важнейшыя пытаньні.

АБ ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ ЗАВОЗУ Ў БССР ПРАМТАВАРАЎ.

Выслухаўшы даклад НК Гандлю БССР аб завозе ў БССР прамысловых тавараў за 1-ы квартал і аб пэрспэктывах забесьпячэньня на 2-гі квартал 1927-28 г., Савет Народных Камісараў пастанавіў прасіць Савет Працы і Абароны зрабіць паказаньні НК Гандлю СССР на патрэбнасьць павялічэньня завозу ў БССР прамысловых тавараў і павялічыць спэцыяльны фонд тавараў для забясьпечаньня ільнаводных раёнаў, а таксама скураных тавараў для пашырэньня скураных загатовак і каб завоз у БССР дэфіцытных тавараў рабіўся раўнамерна на кожны месяц.

Белкаапсаюзу і Белсельсаюзу запрапанавана прыняць меры да поўнага задаваленьня рынку таварамі, якія ёсьць у выстарчальным ліку, і да ўтварэньня належных пераходзячых запасаў на месцах, якія гарантавалі беспераболнае забесьпячэньне. НК Гандлю і ВСНГ запрапанавана прасачыць за тым, каб максымальны лік прадукцыі беларускай прамысловасьці быў скарыстаны на патрэбы беларускага рынку, а таксама падаць у Эканамічную Нараду прапановы аб вытворчасьці і павялічэньні забесьпячэньня сялянскага рынку саматужна-прамысловым таварам.

АБ АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ ФОРМАХ БРОВАРНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Разгледзеўшы ўнесенае Дзяржпланам пытаньне аб арганізацыйных формах броварнай прамысловасьці, СНК пастанавіў пакінуць у БССР часова, да выяўленьня далейшых пэрспэктыў разьвіцьця броварнай прамысловасьці, абедзьве арганізацыі—Беларускі Сельска-Гаспадарчы Трэст і Беларускае Кіраўніцтва Дзяржаўнай Сьпіртусовай Манаполіі. У веданьне Белсельтрэсту перадаюцца ўсе бровары, якія знаходзяцца на тэрыторыі савецкіх гаспадарак, а ўсе іншыя бровары пакідаюцца ў веданьні Беларускага Кіраўніцтва Дзяржаўнай Сьпіртусавай Манаполіі. СНК прызнаў мэтазгодным узьняць перад органамі СССР пытаньне аб перадачы Беларускаму Кіраўніцтву Дзяржаўнай Сьпіртусовай Манаполіі вытворчых функцый Дзяржаўнай Сьпіртусовай Манаполіі СССР.

АБ ПРАЦОЎНАЙ І ТРАНСПАРТНАЙ ПАВІННАСЬЦІ.

СНК прыняў распрацаваны КЗП пры СНК БССР праэкт палажэньня аб парадку прыцягненьня насяленьня да працоўнай і транспартнай павіннасьці. Паводле гэтага палажэньня прыцягненьне насяленьня да працоўнай і транспартнай павіннасьці дазваляецца толькі для змаганьня з надзвычайнымі няшчасьцямі, якія ня могуць быць спынены сродкамі адпаведных дзяржаўных і грамадзкіх органаў, а таксама для дапамогі Чырвонай арміі ў часе мабілізацыі. У выпадках навальных няшчасьцяў насяленьне можа прыцягвацца да працоўнай і транспартнай павіннасьці толькі для лёкалізацыі і ліквідацыі здарыўшыхся няшчасьцяў. Прыцягненьне насяленьня да гэтай павіннасьці для перасьцярогі ад навальных няшчасьцяў дазваляецца ў выключных выпадках, калі работы па перасьцярозе ад няшчасьця ня могуць быць выкананы вольна-наёмнаю рабочаю і транспартнаю сілаю і толькі пры ўмове, што невыкананьне гэтых работ у тэрміновым парадку пагражае катастрафічнымі вынікамі. Да працоўнай і транспартнай павіннасьці не прыцягваюцца асобы, прадугледжаныя арт арт. 12 і 13 Кодэксу Законаў аб Працы.

Работы, праведзеныя ў парадку працоўнай і транспартнай павіннасьці, аплачваюцца тым органам, для якога яны беспасрэдна праводзіліся. Нормы аплаты гэтых работ устанаўляюцца НК Працы па ўзгадненьні з ЦСПСБ і зацьвярджаюцца Эканамічнай Нарадаю пры СНК БССР. Прыцягваць да работ, прадугледжаных гэтым палажэньнем маюць права мясцовыя саветы і акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты. Нез'яўленьне асоб, якія прыцягваюцца да працоўнай і транспартнай павіннасьці, у вызначанае месца і час, а таксама адмаўленьне ад выкананьня павіннасьці караецца ў крымінальным парадку.

АБ НАЦЫЯНАЛІЗАВАНЫХ І МУНІЦЫПАЛІЗАВАНЫХ БУДЫНКАХ.

З мэтаю вызначэньня і ўрэгуляваньня праў, якія належаць цэнтральным і мясцовым органам улады на нацыяналізаваныя і муніцыпалізаваныя будынкі, СНК прыняў унесены Дзяржпланам праэкт пастановы ЦВК і СНК аб нацыяналізаваных і муніцыпалізаваных будынках і парадку карыстаньня імі.

Нацыяналізаванымі будынкамі, згодна гэтай пастановы, лічацца: а) будынкі, якія скарыстоўваюцца для сваіх патрэб адпаведнымі цэнтральнымі ведамствамі або іх мясцовымі органамі, што знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце; б) помнікі старажытнасьці, мастацтва і быту, якія абвешчаны дзяржаўнай уласнасьцю, а таксама будынкі дзяржаўных тэатраў, музэяў і бібліятэк рэспубліканскага значэньня; в) будынкі, прызнаныя нацыяналізаванымі пастановамі ЦВК і СНК БССР; г) будынкі, якія складаюць неабходную належнасьць нацыяналізаваных фабрык, заводаў, а таксама і транспарту і неразрыўна зьвязаныя з іх вытворчасьцю; д) будынкі, пабудаваныя для патрэб ваенведу; е) будынкі, якія знаходзяцца на тэрыторыі дзяржаўных зямельных маемасьцяў і скарыстоўваюцца паводле Зямельнага Кодэксу. Усе іншыя будынкі, якія складаюць уласнасьць дзяржавы, лічацца муніцыпалізаванымі і знаходзяцца ў веданьні мясцовых выканаўчых камітэтаў.

Калі нацыяналізаваныя будынкі ня будуць скарыстоўвацца па прызначэньню, то яны перадаюцца, на падставе адпаведных пастаноў, належным органам або ў муніцыпалізаваны фонд. Далей, у пастанове гаворыцца аб складаньні сьпісаў нацыяналізаваных будынкаў і аб акруговых камісіях для разгляду гэтых сьпісаў.

АБ ПЕРАДАЧЫ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫМ КАЛЕКТЫВАМ ПРАМЫСЛОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ.

З мэтаю ўзмацненьня сельска-гаспадарчых калектываў і дапамогі індустрыялізацыі іх гаспадарак СНК на падставе пастановы ЦВК і СНК СССР за 16-III—1927 г. прыняў падалы Дзяржпланам праэкт пастановы СНК БССР аб перадачы сельска-гаспадарчым калектывам прамысловых і дапаможных прадпрыемстваў. Паводле гэтай пастановы ва ўладаньне, карыстаньне і распараджэньне сельска-гаспадарчых калектываў на ўмовах, прадугледжаных гэтаю пастановай, перадаюцца бездаплатна прамысловыя і дапаможныя прадпрыемствы і пабудовы, якія знаходзяцца ў веданьні дзяржаўных, каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый і прадпрыемстваў мясцовых саветаў і выканаўчых камітэтаў, калі гэтыя прадпрыемствы знаходзяцца ў межах зямель, якія знаходзяцца ў карыстаньні гэтых сельска-гаспадарчых калектываў. Гэтаю пастановаю прадугледжваецца парадак і правілы перадачы прадпрыемстваў сельска-гаспадарчых калектывам і інш.

ПРА АБАВЯЗКІ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ УЛАДЫ Ў РАЙЁНАХ КАМПЛЕКТАВАНЬНЯ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫХ ВОЙСК.

Для забясьпечаньня нармальнай работы тэрытарыяльных войск з пераменным складам, СНК прыняў пастанову, паводле якой мясцовыя органы ўлады ў раёнах камплектаваньня тэрытарыяльных войск павінны праводзіць наступныя работы: у галіне дапамогі арганізацыі тэрытарыяльных войск, у галіне народнай асьветы, аховы здароўя, вэтэрынарыі, а таксама работы, якія павінны праводзіць акруговыя выканаўчыя камітэты.

Гэтаю пастановаю дакладна пералічаюцца ўсе віды работ, якія павінны праводзіць мясцовыя органы ўлады па кожнай з гэтых галін.

ПРА ПЕРАДАЧУ БЕЛСЕЛЬТРЭСТУ ПРЫПІСНЫХ САВЕЦКІХ ГАСПАДАРАК.

На гэтым пасяджэньні Саветам Народных Камісараў вырашана пытаньне пра перадачу Бельсельтрэсту прыпісных савецкіх гаспадарак і тэхнічных прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на тэрыторыі савецкіх гаспадарак.

Паводле пастаноў СНК у веданьне Бельсельтрэсту перадаецца шэраг бровараў, якія знаходзяцца ў трэстыраваных савецкіх гаспадарках і гаспадарча з імі зьвязаных, шэраг савецкіх гаспадарак мясцовага значэньня, якія знаходзяцца ў веданьні раённых выканаўчых камітэтаў і эксплёатуюцца Беларускім Кіраўніцтвам Дзяржаўнай Сьпіртусовай Манаполіі, а таксама шэраг савецкіх гаспадарак, якія знаходзяцца ў веданьні іншых дзяржаўных органаў. НК Земляробства даручана перагледзець сьпіс савецкіх гаспадарак, якія знаходзяцца ў веданьні навучальных устаноў і НК Унутраных Спраў, праверыць мэтазгоднасьць эксплёатацыі ўсіх гэтых гаспадарак з мэтаю ўстанаўленьня, якія з гэтых гаспадарак могуць быць перададзены Белсельтрэсту.

Перадача савецкіх гаспадарак Белсельтрэсту павінна быць зроблена з такім разьлікам, каб вясеньнюю пасеўную кампанію 1928 г. праводзіў Белсельтрэст. НК Земляробства і РСІ запрапанавана распрацаваць пытаньне аб арганізацыйнай структуры кіраўніцтва савецкімі гаспадаркамі.

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Серада, 8-II „Цар Максімільян“, драма ў 2 дз. з інтэрмэдыяй. 5-ты агульнадаступнік для студэнтцтва.
Нядзеля, 12-II „Бакханкі“, трагэдыя ў 3-х дзеях. Паказ для шэфтаварыства Дзяржстраху. Пачатак а 8 з пал. гадз. вечара.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР.

Чацьвер, 9-II. Спэктакль для рабочае моладзі
„ОВЕЧИЙ ИСТОЧНИК“. Білеты ў клюбе Кіму ад 7 да 10 гадз. веч.
Пятніца 10-II. „Овечий источник“.
Білеты ў касе тэатру ад 12 да 2 гадз. дня і ад 5 да 9 гадз. веч.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» — Грандыёзны фільм — „Из-под сводов мечети“. Драма ў 7 частк. Наступная пастаноўка—„Конец Санкт-Петербурга“.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“. Мастацкі баявік—вялікая ўсходняя пастаноўка „Трижды проданная“ („ТАМИЛА“). У 7 частк. Штодня—4 сэансы.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — З-ЦІ ТЫДЗЕНЬ У МЕНСКУ! — —) „ВАР'ЕТЭ“. (— Пачатак сэансаў у 7, 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. увечары.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“. Грандыёзны трукавы фільм „Отрезанные от мира“. 1-я сэрыя ў 8 частк.

Хроніка.

У ЦС Оса-Авіяхіму БССР.

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Чырвонай арміі.

Цэнтральны савет Оса-Авіяхіму БССР даў указаньні акруговым саветам прыступіць да падрыхтоўкі сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Чырвонай арміі. У часе падрыхтоўкі неабходна склікаць нарады актыву, на якіх належыць прапрацаваць плян сьвяткаваньня і даць канкрэтныя ўказаньні ячэйкам.

Навуковыя працаўнікі—на працу ў Оса-Авіяхім.

Віцебскі акруговы савет Оса-Авіяхіму зьвярнуўся да навуковых працаўнікоў Віцебску, каб апошнія прынялі ўдзел у навукова-дасьледчай сэкцыі Оса-Авіяхіму. Ужо адбылася першая арганізацыйная нарада, на якой выбрана бюро навукова-дасьледчай сэкцыі.

Рэвізія фінансава-матар'яльнай дзейнасьці Беларускага Оса-Авіяхіму.

Рэвізійная камісія Оса-Авіяхіму БССР правяла рэвізію фінансава-матар'яльнай дзейнасьці Беларускага Оса-Авіяхіму. Камісія зьвярнула ўвагу на несваячасовую і неакуратную прысылку фінансавых матар'ялаў акруговымі саветамі ў ЦС Оса-Авіяхіму БССР.

У І-м беларускім дзяржаўным тэатры.

Новыя пастаноўкі.

БДТ І, які зараз працуе ў Віцебску, закончыў п'есу „Чаму замоўк гармонік“—Рамановіча; аднаўлены музычныя п'есы „Мешчанін у шляхецтве“ і „Машэка“. Рыхтуецца да пастаноўкі п'еса Зорава „Імя ім легіён“; мае быць пастаўлена п'еса Быль-Беларацкоўскага „Месяц зьлева“.

Канец сэзону тэатр мае закончыць камэдыяй Грамыкі.

Бліжэй да мас.

У пачатку сакавіка тэатр мае выехаць у Магілеў, дзе будзе працаваць каля 2-х месяцаў.

Перад гэтым тэатр зробіць некалькі пастановак у Полацку. У пачатку мая тэатр наладзіць некалькі спэктакляў у Воршы і, урэшце, сэзон будзе закончан у Менску.

Ад'езд тав. Хацкевіча ў Маскву.

6-га лютага выехаў у Маскву па службовых справах сэкратар ЦВК БССР тав. Хацкевіч.

Павялічэньне сродкаў на дашкольныя ўстановы.

У БССР зараз ёсьць 148 дзіцячых пляцовак, 62 сады і 23 дзіцячых ачагоў. У бягучым апэрацыйным годзе бюджэт на ўтрыманьне гэтых дашкольных устаноў павялічан на 23 проц.

Падрыхтоўка да выстаўкі краязнаўчых зарысовак.

ЦБ Краязнаўства чынна рыхтуецца да выстаўкі краязнаўчых фатаграфій і зарысовак. Удзел у выстаўцы прымаюць дзяржаўныя інстытуцыі, краязнаўчыя арганізацыі, аб'яднаньні фатографаў і мастакоў, аматары, калекцыянэры і інш.

Зарысоўкі і фатаграфіі прымаюцца да 10-га красавіка. Перасылка іх у ЦБК і назад—бясплатная.

Выстаўка костак жывёлін ледавіковага пэрыяду.

Учора ў канфэрэнц- залі ІБК адчынілася выстаўка костак жывёлін ледавіковага пэрыяду (палеаліту).

Тут сабрана шмат костак маманта, пераважна маладога, бізова, пясца і інш. Выстаўка будзе адчынена цэлы тыдзень.

Рост паліграфічнай вытворчасьці.

За мінулы год у БССР было выпушчана 652 кнігі, з агульным тыражом у 1785015 экзэмпляраў. З гэтай колькасьці кніг на беларускай мове выдадзена—389, на расейскай—206, на яўрэйскай—41 і на польскай—16. Трэба адзначыць, што ў 1927 г у БССР было выпушчана на 50 проц. больш кніг, чым у 1926 г.

Работніца—на больш кваліфікаваную працу.

За апошні час у БССР пераведзена на больш кваліфікаваную працу з павышэньнем разраду 225 работніц.

Зараз камісія па жаночай працы пры Нар. Кам. Працы БССР праводзіць абсьледаваньне, як выпаўняюцца дырэктывы па высоўваньні жанчын на больш кваліфікаваную працу.

Рэалізацыя прадукцыі беларускай прамысловасьці.

Маскоўская кантора Белвайгандлю прыступіла да рэалізацыі прадукцыі беларускай прамысловасьці. У бягучым годзе кантора прадугледжвае рэалізаваць прадукцыю Гомельскай абутковай фабрыкі—на 100000 руб. і розныя вырабы „Палесдруку“ на 50000 руб.

Пабудова сушыльнага заводу.

Рэспубліканскім інжэнэрам і інспэктарыятам працы ўжо зацьверджан праэкт пабудовы ў савецкай гаспадарцы Забалацьце, Аршанскай акругі, буйнага сушыльнага заводу. Ужо прыступлена да загатоўкі будаўнічага матар'ялу. Да сэзону сушкі фруктаў гэты завод будзе поўнасьцю абсталёван.

Колькі будзе завезена мінэральнага ўгнаеньня.

У 2-м квартале 1927-28 апэрацыйнага году беларускае аддзяленьне Цэнтразэмскладу мае атрымаць 1200 тон суперфасфату і 900 тон фасфарытнай мукі. Гэта мінэральнае ўгнаеньне пойдзе на забесьпячэньне сельскіх гаспадарак у часе вясеньняй пасяўной кампаніі.

Дастаўка пасылак на кватэры.

З 1 лютага, згодна пастановы Менскай паштова-тэлеграфнай канторы, усе пасылкі вагой да 35 кгр. і вартасьцю да 600 руб. будуць дастаўляцца на кватэры. Гэта мерапрыемства дасьць магчымасьць пазбавіцца ад вялікай чаргі пры атрыманьні пасылак.

Вынікі археолёгічнай экспэдыцыі ў в. Бэрдыж.

На гэтых днях у ІБК былі прадэманстраваны экспанаты археолёгічнай экспэдыцыі ІБК каля в. Бэрдыж, Чачэрскага р, Гомельскай акругі. Археолёгам Палікарповічам і палеонталёгам Громавым (супрацоўнік Акадэміі Навук СССР) былі зроблены даклады аб выніках працы ў гэтай галіне.

Культура, знойдзеная пры раскопках, адносіцца да ледавіковага пэрыяду, калі фауна і расьліны сьвет рэзка адрозьніваліся ад сучаснай, і якая ў археолёгіі носіць назву палеоліта.

На Беларусі сьляды такой культуры да апошняга часу ня былі вядомы. Першае знаходжаньне (стаянкі) палеолітнай культуры выяўлена ў 1926 г. К. М. Палікарповічам. Пробныя раскопкі 1926 г. устанавілі, што ў гэтым месцы (каля в. Бэрдыж) знаходзіцца пэўныя сьляды палеолітнай культуры (крамнёвыя прылады, сьляды ўжываньня агню і інш.), дзе таксама была знойдзена вялікая колькасьць костак вымёршых жывёлін ледавіковага пэрыяду—маманта, каня, мядзьведзя. Экспэдыцыя 1927 г. зноў знайшла шмат костак гэтых жывёлін; галоўнае месца сярод іх займаюць косткі маманта, прыблізна 16 экзэмпляраў. Апроч таго, тут знойдзены косткі каня, мядзьведзя, ваўка, бізона (Bos priscos), магчыма, і пясца. Усе гэтыя віды жывёлін ці вымерлі, ці перасяліліся далёка на поўнач, як пясец.

Рэшта культур прадстаўлена слабей. Ёсьць нажападобныя крамнёвыя пласткі, крамнёвыя разцы, адзін бівень мамонта са штучна састругаванай паверхняй. Тут-жа было знойдзена шмат кавалкаў крэмня, якія былі прынесены чалавекам у мэтах выпрацоўкі з іх прыладаў.

Стаянку першабытнага чалавека трэба лічыць далёка недасьледаванай. Да гэтага часу толькі вывучаны месца адкідаў, а самае вогнішча, асяродак, яшчэ не дасьледаваны. Далейшае вывучэньне стаянкі будзе прадаўжацца.

У Аўтадоры.

ДА ВЕДАМА ЯЧЭЕК.

Усе аддзяленьні і мясцовыя ячэйкі Аўтадору павінны ўнесьці сабраныя сяброўскія і ўступныя ўзносы, за вылікам устаноўленых адлічэньняў на свае арганізацыйныя выдаткі, на бягучы рахунак Праўленьня Т-ва № 682 у Беларускай канторы Дзяржбанку.

Ячэйкі Аўтадору павінны прадставіць Праўленьню сьпісы сваіх сяброў дзеля загатоўкі сяброўскіх білетаў.

РЭГІСТРАЦЫЯ ЯЧЭЕК.

Рэгістрацыя ячэек Аўтадору вядзецца Праўленьнем Т-ва штодня ад 6-й да 9-й г. вечара.

Калектывы рабочых і служачых, якія жадаюць арганізаваць на сваіх прадпрыемствах ячэйкі Аўтадору, павінны загадзя паведаміць Праўленьне аб дні сходу для камандыраваньня дакладчыка. Тэлефон праўленьня № 710.

У СЭКЦЫЯХ.

Дарожнай сэкцыі запрапанавана распрацаваць плян удзелу Аўтадору БССР у дарожным будаўніцтве на аснове закону аб самаабкладаньні насельніцтва.

Сёньня, 8-га лютага, а 6-й гадзіне вечара ў памяшканьні праўленьня (Савецкая вул. № 82) адбудзецца пасяджэньне аўтатрактарнай сэкцыі.

Запрашаюцца т.т. Шуб (Аквтынком), Макрыцкі (Дзяржплян), Рабіновіч (пажарная каманда), Селязьнёў (ЦРК), Сельдзіс і Малко (завод Дрэвапр.), Амбражунас (зав. «Энэргія») і Поскало (ДПУ).

Аб матар'ялах пра БССР у „Большой Советской Энциклопедии“.

Кіраўніцтва Спраў Савету Народных Камісараў БССР затрабавала ад усіх народных камісарыятаў, цэнтральных устаноў і акруговых выканаўчых камітэтаў прадставіць у 3-хдзённы тэрмін зьвесткі аб тым, што зроблена ў сэнсе падрыхтоўкі і рэдагаваньня матар'ялаў пра БССР для „Большой Советской Энциклопедии“.

Здарэньні.

НЕСПАДЗЯВАНАЯ СЬМЕРЦЬ.

У в. Валоўнікі, Койданаўскага раёну, у студні знойдзен труп гр-на М. Адамчыка. Дазнаньнем устаноўлена, што Адамчык утапіўся сам.

У той-жа в. Валоўнікі неспадзявана памёр паўтарагадовы хлопчык М. Шчэпа. Ёсьць падазрэньне, што хлопца атруціў яго бацька. Робіцца мэдыцынскі дасьлед трупа.

СПРАВА З КАРОВАЮ МЯТЛІЦКАГА.

У в. Навінка 29 студзеня ў гр-на Ю. Мятліцкага невядомыя злачынцы ўкралі карову коштам у 180 руб. Праз некалькі дзён гэта карова была выкрыта: затрыманы В. Клімовіч і А. Пятухоўскі. У апошняга агент Крымінальнага Вышуку знайшоў захаванае мяса з гэтай каровы. Жонка Пятухоўскага, убачыўшы, што кража выкрыта і яе муж будзе злодзеем, павесілася. Агенту Крымвышуку, аднак, удалося зьняць яе з пятлі яшчэ жывою.

РАБУНАК.

У 2-х вярстох ад Барысава на дарозе ў Вялікае-Стахава быў абрабаваны гр-н хут. Старынка П. Вярціцкі. Невядомыя злачынца, пагражаючы рэвальвэрам, забраў у яго 80 руб. На падазрэньні ў грабяжы затрыман Б. Кузенец з г. Барысава.

ПАДПАЛЬШЧЫК.

У в. Баб'я-Гара (Барысаўшчына) загарэліся і згарэлі будынкі гр-на А. Вайцяховіча. Дазнаньнем устаноўлена, што падпал зрабіў сусед С. Сярмяжка.

Апавяшчэньне.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня роўна а 7 гадз. увечары адбудзецца сход настаўнікаў-камуністых ячэйкі працасьветы, працуючых у школах гор. Менску.

8-га лютага кіно „ПОБЕДА ЖЕНЩИНЫ“; сэансы ў 7 і 9 гадз. Карціну суправаджае музыка.

Адчынен запіс у санітарны гуртох.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА Савету Народных Камісараў Беларускае ССР

аб прыцягненьні да адказнасьці асоб, якія ня ўжылі патрэбных захадаў для разьвіцьця загатовак льнянога валакна, насеньня і атрыманьня закантрактаванага лёну.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. За няўжыцьцё патрэбных захадаў для разьвіцьця загатовак льнянога валакна і насеньня абвесьціць выгавар з апублікаваньнем у друку Загадчыку Аршанска-Магілеўскім Аддзяленьнем Беларускай Дзяржаўнай Канторы экспорту і імпорту т. Прэсбургеру, Язэпу Саламонавічу, і Загадчыку Полацкім Агенцтвам Беларускай Дзяржаўнай Канторы экспорту і імпорту тав. Рэбекелю, Мікалаю Сьцяпанавічу.

2. За няўжыцьцё патрэбных захадаў да разьвіцьця загатовак льнянога валакна і насеньня і да атрыманьня закантрактаванага лёну абвесьціць выгавар з апублікаваньнем у друку Кіраўніцтвам Полацкага і Віцебскага Саюзаў Акруговай Сельска-Гаспадарчай Каапэрацыі.

3. Запрапанаваць Пракурору Рэспублікі прыцягнуць да судовай адказнасьці, а Кіраўніцтву Беларускага Саюзу Сельска-Гаспадарчае Каапэрацыі ўжыць захады да зьняцьця з працы Старшынь Сіроцінскага і Езярышчанскага Сельска-Гаспадарчых Таварыстваў, Віцебскае акругі, за няўжыцьцё імі патрэбных захадаў да атрыманьня закантрактаванага лёну.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карлін.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. Мароз.**

4 лютага 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ Совета Народных Комиссаров Белорусской ССР

о привлечении к ответственности лиц, не принявших необходимых мер к развитию заготовок льняного волокна, семени и получения законтрактованного льна.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. За непринятие необходимых мер к развитию заготовок льняного волокна и семени об'явить выговор с опубликованием в печати Заведующему Оршанско-Могилевским Отделением Белорусской Государственной Конторы экспорта и импорта тов. Пресбургеру, Иосифу Соломоновичу, и Заведующему Полоцким Агентством Белорусской Конторы экспорта и импорта т. Ребекелю, Николаю Степановичу.

2. За непринятие необходимых мер к развитию заготовок льняного волокна и семени и к получению законтрактованного льна об'явить выговор с опубликованием в печати Правлениям Полоцкого и Витебского Союзов Окружной Сельско-Хозяйственной Кооперации.

3. Предложить Прокурору Республики привлечь к судебной ответственности, а Правлению Белорусского Союза Сельско-Хозяйственной Кооперации принять меры к снятию с работы Председателей Сиротинского и Езерищенского Сельско-Хозяйственных Товариществ, Витебского округа, за непринятие ими необходимых мер к получению законтрактованного льна.

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР **М. Карлин.**

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **М. Мороз.**

4 февраля 1928 г.
г. Минск.

ПАСТАНОВА Савету Народных Камісараў Беларускае ССР

АБ ПАБУДОВЕ ТРАМВАЮ Ў гор. МЕНСКУ.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Прызнаць патрэбным пачаць у 27-28 бюджэтным годзе пабудову трамваю ў горадзе Менску, для якой мэты ўнесьці ў бюджэт Менскае акругі двесьці пяцьдзесят тысяч рублёў.

2. Даручыць Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры СНК БССР разгледзець пададзены Менскім акруговым выканаўчым камітэтам плян пабудовы трамваю, а таксама ўстанавіць крыніцы фінансаваньня работ і пэўныя тэрміны будаўніцтва.

3. Заключэньне Дзяржаўнае Плянавае Камісіі пры СНК БССР па пытаньнях, паказаных у арт. 2 гэтае пастановы, падаць на зацьверджаньне Савету Народных Камісараў БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Мароз.**

14-16 студзеня 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ Совета Народных Комиссаров Белорусской ССР

О ПОСТРОЙКЕ ТРАМВАЯ В Г. МИНСКЕ.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Признать необходимым приступить в 1927-28 бюджетном году к постройке трамвая в гор. Минске, для каковой цели внести в бюджет Минского округа двести пятьдесят тысяч рублей.

2. Поручить Государственной Плановой Комиссии при СНК БССР рассмотреть представленный Минским окружным исполнительным комитетом план постройки трамвая, а также установить источники финансирования работ и точные сроки строительства.

3. Заключение Государственной Плановой Комиссии при СНК БССР по вопросам, установленным в статье 2 настоящего постановления, представить на утверждение Совета Народных Комиссаров БССР.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **И. Голодед.**

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **М. Мороз.**

14-16 января 1928 г.
г. Минск.

Рознае.

МІЖНАРОДНАЯ ВЫСТАЎКА ЯЕК.

У Ленінградзе ў хуткім часе адчыняецца вялікая міжнародная выстаўка яек. З Нямеччыны і Злучаных Штатаў Амэрыкі ўжо атрыманы абразцы ўпакоўкі, інкубатары, ахаладжаючыя апараты і іншыя экспанаты.

«РАДЫЁ—Д'ЯБЭЛЬСКАЯ НАВАЛА».

У Чанстахове патоўп жанчын-багамолак напаў на манцёра, які хацеў на вуліцы ўстанавіць радыё-прыёмнік. Жанчыны білі манцёра і крычалі: „Радыё, гэта—д'ябэльская навала, за якую пакарае бог“.

ПЕРАДАЧА ПА ТЭЛЕГРАФУ КАЛЯРОВЫХ МАЛЮНКАЎ.

У Амэрыцы адбыліся вопыты перадачы па тэлеграфу каляровых малюнкаў. Каляровыя малюнкі з посьпехам былі перададзены на адлегласьці 4.000 кілёмэтраў.

КРАХ БАНКУ ДРОСТЭ.

У Гота (Нямеччына) банкір Дростэ застрэліў жонку і двое малых рабят, а затым і сам застрэліўся. Прычыны гэтаму—крах яго банку.

КОШКА—10.000 РУБЛЁЎ.

Ангельская буржуазея наладзіла ў Лёндане выстаўку гатунковых кошак. Адна з кошак, якія былі на выстаўцы, прададзена за 10.000 рублёў.

Паштовая скрынка.

С. І. „Аб Гораднім рынку хлебазагатовак“ друкавацца ня будзе. Пішаце, як вядуць загатоўкі дзяржаўныя і каапэрацыйныя арганізацыі ў апошні час.

Мар'яну. Заметка „Пазыка на вёсцы“ ў друк ня пойдзе—няма рэальных фактаў.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 6
Менскага Гарадзкога Савету

ад 6-га лютага 1928 г.

АБ ПАРАДКУ АДЧЫНЕНЬНЯ, АРГАНІЗАЦЫІ І ЎТРЫМАНЬНЯ РЭСТАРАНАЎ, СТАЛОВЫХ, КАФЭЙНЫХ, БУФЭТАЎ, ПІЎНЫХ.

Менскі Гарадзкі Савет—**пастанаўляе:** прыняць наступныя правілы аб парадку адчыненьня, арганізацыі і ўтрыманьня рэстаранаў, сталовых, кафэйных, буфэтаў і піўных.

1. Усе адзначаныя ўстановы могуць адчыняцца і пераводзіцца з аднаго памяшканьня ў другое ня інакш, як з дазволу Саннагляду, на падставе агляду камісіі ў складзе: гарадзкога санітарнага доктара і гарадзкога архітэктара.

2. Памяшканьні для адзначаных устаноў павінны быць сьветлыя, мець добрыя сьветлыя хады, як парадны, так і чорны, ізаляваны ад жылья і мець добрае праветрываньне як у пакоях, так і ў кухні.

3. У гэтых памяшканьнях павінны быць пастаўлены ў патрэбнай колькасьці пляваценьніцы з вадой на падстаўцы вышынёй ня менш 0,55 м.

4. Усё сталовае і буфэтнае начыньне павінна быць чыстым; выціраецца начыньне павінна чыстымі ручнікамі; чыстае і запаснае начыньне, а таксама нажы, відкі, лыжкі і інш. сталовыя рэчы павінны трымацца на паліцах ці ў шафах.

5. Сталовая бялізна, а таксама гардзіны і фіранкі на дзьвярах і вокнах павінны быць заўсёды чыстыя.

6. Мыць сталовую бялізну ў памяшканьні сталовых і кухняў забараняецца.

7. У кухнях пры сталовых падлогі павінны быць кафэльныя, асфальтавыя, бэтонныя ці драўляныя, бяз шчылін, заўсёды ўтрымліваецца ў чыстаце.

8. Хаваньне ў кухні вопраткі і бялізны і наогул якіх-небудзь рэчаў, апроч начыньня і неабходных для кухні прыладаў і мэблі—забараняецца.

9. Калі няма вадаправоду, ў кухні павінны быць спэцыяльныя рэзэрвуары ці кадкі для вады з кранамі і крышкамі.

10. Для кухонных рэштак у кухнях павінны быць спэцыяльныя скрыні ці вёрды, якія павінны штодня выносіцца.

11. Уся кухонная мэбля і начыньне павінны чыста ўтрымлівацца: медзянае начыньне павінна быць добра вылуджана. Вымытае чыстае начыньне павінна хавацца на паліцы ці ў шафе.

12. Кухары і кухаркі павінны быць апрануты ў белыя, чыстыя кашулі, халаты ці фартухі і каўпакі.

13. Бурыць у кухні забараняецца.

14. Сьпіжарні для харчоў, леднікі і скляпы павінны знаходзіцца ня бліжэй 6,4 м. ад памыйных ям, стайняў і г. д. Яны павінны ўтрымлівацца ў чыстаце і не павінны быць месцам хаваньня якіх-небудзь харчоў апроч правізіі. У сьпіжарнях павінны быць зачыненыя скрыні для сухіх харчоў. Мяса павінна вісець на круках, правізія, якая хаваецца ў ледніку, не павінна ляжаць на лёдзе, а ў якім-небудзь чыстым начыньні ці на чыстых пасьцілках з палатна, зьверху яно таксама павінна быць прыкрыта ці крышкамі, ці чыстым палатном.

15. Харчовыя рэчы і закускі ў буфэтах павінны быць сьвежыя і добрай якасьці, на прылаўках яны павінны быць пакрыты шкляннымі каўпакамі, ці каўпакамі з сеткай.

16. Ва ўсіх установах, як для публікі, таксама і для працуючых павінны быць асобныя рукамыйнікі з мылам і чыстымі ручнікамі пры іх, а таксама і вешалкі для верхняга адзеньня.

17. Ва ўсіх сталовых, кафэйных, рэстаранах і буфэтах для публікі павінна быць у патрэбнай колькасьці чыстая, халодная, кіпячоная вада ў закрытай пасудзе.

18. У кожнай установе на відным месцы павінна быць кніга для скаргаў.

19. Гэтая абавязковая пастанова павінна быць вывешана на відным месцы ў рэстаранах, сталовых, буфэтах, піўных.

20. Нагляд за выкананьнем гэтае абавязковае пастановы ўскладаецца на Санагляд і Міліцыю.

21. Вінаватыя ў невыкананьні гэтае абавязковае пастановы будуць падпадаць штрафу ў адміністрацыйным парадку да 100 руб. ці прымусовым работам да 1-га месяца.

22. Гэтая пастанова набывае моц праз 7 дзён з дню абвяшчэньня.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету **ЯЦКЕВІЧ.**

Сэкратар **ПАСЫНКОЎСКІ.**

БЕЛАРУСКІ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ СЕЛЬСКАЕ І ЛЯСНОЕ ГАСПАДАРКІ ІМЯ Ул. І. ЛЕНІНА ПРЫ СНК БССР

АБВЯШЧАЕ **КОНКУРС**

НА ЗАМЯШЧЭНЬНЕ НАСТУПНЫХ ПАСАД:

1. Загадчык Гідролёгічнай Станцыі (у стадыі арганізацыі), з 1 сакавіка. Першапачатковая стаўка 120 руб. у месяц.
2. Кіраўнік работ па вывучэньні азёр Беларусі, з 1-га мая. Стаўка 120 рублёў у месяц.
3. Асьпірант па мэліарацыйнай спэцыяльнасьці, з 1-га красавіка. Стаўка 75 рублёў у месяц.
4. Асыстэнт зоотэхнік ст. па дасьлед. чырв. беларускага быдла, з 1-га сакавіка. Стаўка 120 руб. у месяц.
5. Асыстэнт па аграфізычных досьледах Менскай Дасьледчай Паляводчай Станцыі, з 1-III—28 г. Стаўка 120 руб. у месяц.
6. Асыстэнт па прыкладной батаніцы МПСт, з 1-III—1928 г. Стаўка 120 рублёў у месяц.

ЗАЯВЫ з жыцьцапісам прымаюцца Інстытутам да 25 лютага г. г. па адрасу: МЕНСК, ШЫРОКАЯ ВУЛІЦА, 28.

Савет Інстытуту.

ОБ'ЯВЛЕНИЕ.

Настоящим Ликвидационная Комиссия БЕЛАВТОПРОМТОРГА об'являет, что, на основании 109 ст. Положения об Акционерных О-вах, СОЗЫВАЕТСЯ НА 19 ФЕВРАЛЯ 1928 г. В 12 ЧАС. в помещении Ликвидкома (Минск, Советская 82, 2-й этаж)

ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

Авто-Транспортного Торгово-Промышленного Акционерного Об-ва «БЕЛАВТОПРОМТОРГ» для предварительного рассмотрения ликвидационного баланса и заключительного ликвидационного баланса.

ПРИМЕЧАНИЕ: В случае, если к означенному времени число собравшихся будет представлять менее половины основного капитала, на основании § 37 Устава Об-ва, вторичное общее собрание назначается на 20-е февраля 1928 г. и будет считаться законным при любом количестве собравшихся акционеров.

ЛИКВИДКОМ БЕЛАВТОПРОМТОРГА.

ИЗВЕЩЕНИЕ.

Настоящим ЛИКВИДАЦИОННАЯ КОМИССИЯ БЕЛАВТОПРОМТОРГА извещает, что на **20-е февраля 1928 г. в 18 час.** в помещении Ликвидкома (г. Минск, Советская № 82—2-й этаж)

— СОЗЫВАЕТСЯ —

СОБРАНИЕ КРЕДИТОРОВ

быв. Авто-Транспортного Торгово-Промышленного Акционерного Об-ва **„БЕЛАВТОПРОМТОРГ“** для заслушания информации Ликвидкома о порядке, размере и условий распределения между кредиторами ликвидационных средств.

ЛИКВИДКОМ БЕЛАВТОПРОМТОРГА.

Галоўліт 302.

1 Дзярж. друкарня.